Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!
Wszystkich krajów, łączcie się! Proletarierы wszystkich krajów, łączcie się!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЕЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.
ОРГАН ЦЕНТРАЛЬНОГО ИСПОЛНИТЕЛЬНОГО КОМИТЕТА СОВЕТОВ РАБОЧИХ, КРЕСТЬЯНСКИХ И КРАСНОАРМЕЙСКИХ ДЕПУТАТОВ БЕЛОРУССКОЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
12 ліпеня 1931 г.
№ 158 (3247)

Г. С. «Савецкая Беларусь» Москва, Моховая, 6 Публичная библиотека СССР им. Ленина отд. обмен. адвін экз.

Праполка і ўборка льна— ударная задача

Перад намі стаіць вялізарнейшая задача, пастаўленая партыяй і савецкай уладай, правесьці ўборку ўраджаю паударнаму, па-баявому. Ніводнага кілё сена, ніводнага кілё зерня не павінна застацца на полі, не павінна быць пакінутым. Для выкананьня гэтай задачы патрэбна максымальная арганізаванасьць, максымальна чоткае правядзеньне ў жыцьцё дырэктыў і пастаноў партыі і ўраду. Для выкананьня гэтай работы патрэбна мабілізацыя і правільная расстаноўка рабочай сілы, ліквідацыя абязьлічкі, увязьненьне зьдзельшчыны і вучот працы.

БССР—адна з рэспублік Савецкага Саюзу, у якой пасевы лёну займаюць вялікія абшары і маюць для народнай гаспадаркі БССР вялізарнейшае значэньне. Пераважная большасьць раёнаў БССР пляны пасеву лёну выканалі цалкам, некаторыя-ж раёны (як, напрыклад, Гарадоцкі) перавыканалі на 200 проц. Аднак, пасеяць лён гэта яшчэ не абазначае завяршыць усю работу. Лён трэба палоць. А між іншым, праполачная кампанія ў нас па радзе раёнаў праходзіць зусім дрэнна. Заўважаецца недаацэнка па праполачнай кампаніі як з боку гаспадарчых, так і партыйных арганізацый паасобных раёнаў. Гэтаму павінен быць пакладзены канец. Партыйныя і гаспадарчыя арганізацыі, праўленьні саўгасаў і калгасаў павінны тэрмінова закончыць праполачную кампанію. Лён павінен быць ачышчаны ад пустазельля,—гэткая баявая неадкладная задача, якая стаіць перад савецкімі, партыйнымі і гаспадарчымі арганізацыямі ўсіх раёнаў.

Трэба з усёй сілай падкрэсьліць, што наглядаецца запаргалае марудныя да падрыхтоўкі ўборкі лёну. З месц сыгналізуюць, што гаспадарчыя арганізацыі, у прыватнасьці праўленьні калгасаў і саўгасаў, спадзяюцца, што машыны прыбудуць і ўборка пройдзе без напружаньня сіл. Такая ўстаноўка зьяўляецца ў корані няправільнай, апартуністычнай установкай. Бо, папершае, гаспадарнікі замест таго, каб мабілізаваць масы і арганізаваць уборку—дэмабілізуюць калгасьнікаў, не вядуць ніякай падрыхтоўчай работы да ўборкі, а спадзяюцца на самацёк.

Зусім дрэнна абстаіць справа з увядзеньнем зьдзельшчыны. Зрух, які пачаўся ў правядзеньні пяцідзёньніку вучоту і ўкараненьня зьдзельшчыны ў калгасах, партыйныя, гаспадарчыя і савецкія арганізацыі ня здолелі замацаваць, разьвіць і канчаткова завяршыць. Наадварот, з раду раёнаў паступаюць трывожныя весткі аб тым, што зьдзельшчына ўводзіцца толькі фармальна. Так, Бабруйскі, Жлобінскі, Барысаўскі і інш. раёны па ўкараненьні зьдзельшчыны цягнуцца ў хвасьце. Ніводзін з гэтых раёнаў ня здолеў пераключыцца на баявыя бальшавіцкія тэмпы, ня здолеў пераключыцца на хуткае і рашучае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі і ўраду.

А між тым практыка паказала, што тыя калгасы, у якіх уведзена зьдзельшчына і правільна пастаўлены вучот, па-бальшавіцку праводзяць сенаўборку, а нават некаторыя ўжо заканчваюць яе. Там-жа, дзе зьдзельшчына і вучот адсутнічаюць, там і сенаўборка праходзіць марудными нікудышнымі тэмпамі.

Савецкія і партыйныя арганізацыі павінны прыкласьці ўсе сілы для найхутчэйшага ўвядзеньня зьдзельшчыны і вучоту. Нельга надалей цярпець такога становішча і праводзіць кулацкую ўраўнілаўку, чым фактычна зрываць барацьбу за замацаваньне посьпехаў другой бальшавіцкай, зрываць барацьбу за далейшы рост, прыліў у калгасы. Ніводнага дня на разважаньні, ураўнілаўка павінна быць ліквідавана. З такой-жа сілай і энэргіяй партыйныя і савецкія арганізацыі, кіраўнікі МТС павінны ліквідаваць, пакончыць з абязьлічкай. Кожны трактар павінен мець прымацаваных трактарыстаў.

Уборцы ўраджаю — бальшавіцкія тэмпы. А для гэтага патрэбна максымальнае напружаньне ўсіх сіл і энэргіі, для гэтага патрэбна максымальная мабілізаванасьць, максымальная арганізаванасьць. Рабочыя-шэфы павінны перанесьці ўзоры сапраўдных ударных бальшавіцкіх тэмпаў работы з фабрык на калгасныя палі. Сацыялістычнае спаборніцтва павінна атрымаць канкрэтныя выразныя аб'екты і формы. Нельга дапускаць расплыўчатасьці, пісаць сацдагаворы аб усім, а на справе не рабіць нічога. Канкрэтная форма і аб'екты паміж спаборнічаючымі калгасамі, паміж паасобнымі калгасьнікамі—неабходная ўмова для сапраўднага бальшавіцкага ажыцьцяўленьня сацспаборніцтва.

Рэдакцыі калгасных насьценных газэт павінны весьці ўпартую барацьбу, выкрываць канкрэтных зрыўшчыкаў, несьбітаў дэзарганізаванасьці, выкрыць кулацкіх падпявал «ураўнілаўкі», зрываць маску з тых, хто на словах за зьдзельшчыну і вучот, а на справе палец аб палец ня стукне для правядзеньня іх у жыцьцё.

Сёньня рэдакцыя нашай газэты прымае шэфства над Гарадоцкім раёнам. Рэдакцыя добра сабе ўяўляе, што яна бярэ на сябе адказнейшую работу вялікага палітычнага і гаспадарчага значэньня. Мы павінны запамагчы партыйным, савецкім і гаспадарчым арганізацыям правесьці ўборку па-сапраўднаму, па-бальшавіцку. Для гэтай мэты рэдакцыя пасылае спэцыяльную выязную рэдакцыю, якая будзе на месцы выдаваць газэту, арганізоўваць масы і асьвятляць барацьбу калгасьнікаў і бядняцка-сераднякіх мас сялянства за своечасовую і поўную ўборку ўраджаю.

Мы ўпэўнены, што калгасьнікі, беднякі і серадняки-алнаасобнікі БССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і на фронце ўборкі лаб'юцца рамог. Наперакор націкам, малаверам, правым і «левым» апартуністам, калгасьнікі згуртованымі радамі, пад пераможным сьцягам камуністычнай партыі, ідуць наперад, да новых перамог.

2-гі ўсебеларускі зьезд рабселькораў

Пад знакам далейшага разгортваньня ўдарніцтва ў дорогу

праходзіць усебеларускі зьезд рабселькораў

Уступнае слова рэдактара ЦО КП(б)Б „Зьвязда" тав. Будзінскага

Другі рабкалгасселькораўскі зьезд зьбіраецца ў час, калі партыя і рабочая кляса ўсяго Савецкага Саюзу пад водзяць вынікі нашай барацьбе за ажыцьцяўленьне пляноў сацыялістычнага будаўніцтва першага паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Гэтыя вынікі па БССР, як і па ўсім Савецкім Саюзе, зьяўляюцца лепшым доказам таго, што наша краіна—краіна сацыялістычнага будаўніцтва і дыктатуры пралетарыяту знаходзіцца на ўздыме, што тэндэнцыі росту працягваюць бурна праяўляцца ў той час, калі капіталістычны сьвет усё глыбей пагружаецца ў вірох жорсткага крызісу, калі ўсё хутчэй нарастае на Захадзе рэвалюцыйная сытуацыя.

Мы па БССР змаглі 40 проц. аднаасобных гаспадарак аб'яднаць у калектывы. Мы памножылі сілы гэтых аднаасобных гаспадарак на пралетарскую арганізацыю працы. Дзякуючы высокім тэмпам росту сацыялістычнай прамысловасьці, мы гэтыя сілы дапоўнілі мэханізацыяй працы.

У Прэзыдыуме зьезду.
Справа. Рэдактар ЦО КП(б)Б «Зьвязда» тав. Будзінскі. Зьлева. Загадчык друку ЦК КП(б)Б т. Курцік.

Гэта—вялізарнае дасягненьне ў параўнаньні з тым становішчам, якое было два гады таму назад.

Але ў параўнаньні з вынікамі калектывізацыі па ўсім СССР наша рэспубліка зьяўляецца цяжкай куляй, якая тармозіць рух наперад усяго СССР. 40 проц. калектывізацыі па БССР зьнімаюць процант калектывізацыі па ўсім СССР. Мы, на жаль, ідзем у абозе барацьбы за калектывізацыю. Мы, на жаль, зьніжаем процант дасягненьняў усяго СССР. Паасобныя раёны БССР ня ўмеюць процант калектывізацыі па-ленінску, па-бальшавіцку ўзьняць на належную вышыню, ня ўмеюць стаць на чале ўзрастаючай актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас сялянства і дабіцца больш шпаркіх тэмпаў калектывізацыі і гэтым зьніжаюць нашы дасягненьні, якія, напрыклад, па Койданаўшчыне і па іншых раёнах даюць нам права гаварыць, што гэтыя раёны ў асноўным завяршылі суцэльную калектывізацыю.

Зразумела, што павялічэньне пасеўнай плошчы БССР на 7 проц. супроць мінулага году, выкананьне пасеўных пляноў па ільне—усё гэта зьяўляецца доказам, што мы расьцем і рухаемся наперад. Таксама аб гэтым руху наперад сьведчаць і вынікі працы нашай сацыялістычнай прамысловасьці, якая павялічыла сваю валавую прадукцыю на 35 проц., у параўнаньні з першай паловай мінулага году.

Гэтыя лічбы паказваюць, што мы можам дагнаць і перагнаць капіталістычны сьвет, які развальваецца ў выніку крызісу, што мы можам перамагчы тую гаспадарчую, тэхнічную і культурную адсталасьць, якую мы атрымалі ў спадчыну пасьля царызму, улады памешчыкаў ды капіталістаў.

Але, каб гэту магчымасьць—дагнаць і перагнаць—ажыцьцявіць, нам трэба памятаць аб тэмпах. Бальшавіцкія тэмпы нашага будаўніцтва адна з галоўных умоў нашай перамогі над капіталістычным сьветам, нашай перамогі ў сусьветным маштабе. Мы будуем сацыялізм ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, перамагаючы супраціўленьне клясавага ворага ўнутры краіны і наскокі і прошукі сусьветнай буржуазіі, якая бачачы ў нашым разьвіцьці галоўную небясьпеку для свайго існаваньня—вогнішча разгортваньня сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, ліхаманкава рыхтуецца да вайны, каб узброенай рукой спыніць сацыялістычнае будаўніцтва, зруйнаваць уладу рабочай клясы. Гэта буржуазія пакуль што практыкуецца ў гэтым на прамку, ужываючы фашысцкі тэрор, які перарастае ў мэтады грамадзянскай вайны, накіраваны на фізычнае зьнішчэньне перадавых барацьбітоў рабочай клясы.

Акрамя гэтага, патрэбы сацыялістычнага будаўніцтва вымагаюць таксама, каб узровень жыцьця працоўных мас у нашай краіне павышаўся хутчэй. Таму ленінская партыя паставіла перад працоўнымі масамі нашай краіны задачу—ня проста дагнаць і перагнаць перадавыя ў сэнсе эканомікі і тэхнікі капіталістычныя краіны, але дагнаць і перагнаць іх у як мага кароткі цейшы гістарычны пэрыяд.

Вось чаму нашы дасягненьні ня могуць нас задаволіць, бо супроць пляну мы не дасялі на 9 проц., па прамысловасьці-ж мы недавыканалі пляны амаль на 15 проц.

Гэтыя ганебныя лічбы патрабуюць ад нас, каб плян другога паўгодзьдзя трэцяга рашаючага году пяцігодкі ажыцьцяўляць такімі тэмпамі, каб мы ня толькі выканалі яго, але пакрылі запазычанасьць і перавыканалі плян.

Для выкананьня гэтай задачы мы маем усе магчымасьці, але трэба, як гэта правільна ўказаў правадыр камуністычнай партыі тав. Сталін у сваёй апошняй прамове, перабудавацца ў ад паведнасьці з новай сітуацыяй і новымі задачамі.

Па лініі сельскай гаспадаркі—пакрыць запазычанасьць азначае, папершае, такім чынам арганізаваць і правесьці праполку тэхнічных культур і гародніны, каб забясьпечыць максымальны ўраджай, па-другое, гэта значыць, такім чынам арганізаваць уборку ўраджаю, каб не прапала, не засталося ў полі ніводнай жменькі ільну або збожжа, каб загатовіць выстар чальную колькасьць кармавых фондаў, выканаць цалкам плян сіласаваньня, па-трэцяе, так арганізаваць загатоўкі і весьці іх такімі тэмпамі, каб уся таварная частка ўраджаю была ў тэрмін у руках дзяржавы, на фабрыках ды ў рабочых цэнтрах; пачацьвертае—г. зн. так разгарнуць працу па калектывізацыі, каб да вясны 1932 г. давесьці калектывізацыю БССР да 75 проц.; па-пятае, г. зн. так весьці асеньнюю пасеўную кампанію, каб пакрыць і перакрыць плян асеньняй сяўбы, які згодна пастановы апошняга пленуму ЦК КП(б)Б патрабуе павялічэньня пасеўнай плошчы ня менш, чым на 120 тыс. гэкт.

Па лініі прамысловасьці задачы ня менш важныя. Гэтыя задачы, я думаю ясны кожнаму.

Для ажыцьцяўленьня ўсіх гэтых задач, як і для далейшага пераможнага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, трэба ў першую чаргу перабудавацца ў напрамку:

Арганізацыі працы так, каб усюды зьнішчыць **абязьлічку**, павысіць адказнасьць кожнага за сваю працу, ды ўстанавіць **кантроль** выкананьня заданьняў.

Рэарганізаваць сыстэму зарплаты такім чынам, каб **зьнішчыць** ураўнілаўку, паставіць зарплату ў простай сувязі з вынікамі ды якасьцю працы.

Максымальна **мэханізаваць усе працэсы працы**, шырока выкарыстоўваючы рабочае вынаходзтва і мясцовыя сілы і матар'ялы.

Шырэй разгортваць сацыялістычныя мэтады працы (сацспаборніцтва, ударніцтва, скразныя і гаспадарча-разрахунковыя брыгады і г. д.).

Цалкам і поўнасьцю скарыстаць як для рамонту машын, так і для будаўніцтва і штодзённай працы ўсе ўнутраныя рэсурсы.

Змагацца за аўладаньне тэхнікай, за выкарыстоўваньне працы старых спэцыялістаў і ўзьняцьце сваёй кваліфікацыі такім чынам, каб замяніць гэтых спэцыялістаў.

Без разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі бяз уздыму рэвалюцыйнай творчай актыўнасьці працоўных мас гэтыя задачы ня могуць быць выкананы. У гэтай справе роля рабкора-ўдарніка, калгаскора-ўдарніка, як дапаможніка партыі, зьяўляецца надзвычай адказнай.

Вялізарныя дасягненьні пралетарыяту СССР зьяўляюцца вынікам устанаўленьня ў нашай краіне дыктатуры пралетарыяту і зьнішчэньня сыстэмы капіталістычнай эксплёатацыі. Нашы дасягненьні—вынік правільнай генэральнай лініі партыі, якая забясьпечыла вялізарны ўздым, рэвалюцыйны энтузіязм і творчую актыўнасьць працоўных мас.

Высокім праяўленьнем гэтага энтузіязму і актыўнасьці мас зьяўляецца рабкалгасселькораўскі рух, які ахапляе найбольш перадавыя пласты працоўных мас. Наш друк ня толькі калектыўны агітатар і прапагандыст, але і калектыўны арганізатар. Гэта арганізатарская роля друку атрымала найбольш яркія формы апэрацыйнасьці ў барацьбе за ліквідацыю прарываў ня толькі словам, выкрываньнем, але і простай вытворча-арганізатарскай работай на вузлавых вучастках нашага будаўніцтва.

Таму і наш рабськор—гэта ня толькі інфарматар, выкрывальнік, але гэта арганізатар мас на сацыялістычнае будаўніцтва, на абарону сацыялістычнай бацькаўшчыны, гэта пачынальнік, ударнік сацыялістычнай будоўлі.

Гэтымі момантамі акрэсьліваюцца задачы нашага зьезду: яны акрэсьліваюцца, з аднаго боку, новымі момантамі ў нашым будаўніцтве, аб чым як выраз на і поўна сказаў т. Сталін, з другога боку,—неабходнасьцямі паставіць на яшчэ больш высокі бальшавіцкі ўзровень наш рабселькораўскі рух. Калі перад нашай прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай стаіць задача аб перабудове сваіх радоў, каб хутчэй разгортваць сацыялістычнае будаўніцтва, дык, зразумела, і перад рабселькораўскім рухам стаяць тыя-ж задачы аб перабудове рабселькораўскага руху ў адпаведнасьці з новымі задачамі нашай партыі, рабочай клясы і калгасных мас сялянства ў даны пэрыяд.

Рабселькораўскі рух у БССР да апошняга часу разгортваўся ў значнай меры самацёкам. Толькі за апошні час партыя і яе органы шчыльна заняліся пытаньнем арганізацыі і кіраўніцтва рабселькораўскім рухам.

У разгортваньні гэтага руху заўсёды вялікую ролю адыгрывала ЦКК КП(б)Б.

Пачынаючы са студзеня 1931 г., рабселькораўскі рух атрымаў свой кіруючы орган—«Рабселькор», які зьяўляецца органам Культпропу ЦО нашай партыі—«Зьвязды». Мы прынялі актыўны ўдзел у рабселькораўскай нарадзе якая была склікана ў Маскве «Правдой». Мы правялі вялікую працу ў папулярызацыі і ажыцьцяўленьні пастаноў гэтай нарады, а таксама ўсіх пастаноў па рабселькораўскім руху ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Трэба падкрэсьліць, што падрыхтоўка да другога ўсебеларускага зьезду рабкалгасселькораў была таксама праведзена як вялізарная, баявая, палітычная кампанія, шчыльна ўвязаная з бягучай барацьбой партыі за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі. Увесь наш друк мабілізаваў свае сілы, каб, выкарыстоўваючы падрыхтоўку да 2-га зьезду, дабіцца рашучага пералому ў справе адносін партыйных, савецкіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый да рабселькораўскага руху. Тэзісы, якія будуць прадстаўлены другому зьезду, былі сур'ёзна прапрацаваны ў рабселькораўскіх масах. Для апрацоўкі іх былі мабілізаваны сілы рэдакцый, гаспадарнікаў спэцыялістаў і рабкораў-ударнікаў. І ў падрыхтоўцы да другога зьезду рабкалгасселькораў, і ў самой працы зьезду актыўны ўдзел будуць прымаць апрача рабкалгасселькораў, гаспадарнікі-спэцыялісты.

Зьезд павінен вырашыць задачу ўзмацненьня кіраўніцтва ўсім рабселькораўскім рухам з боку нашай ленінскай партыі, усіх яе арганізацый, пачынаючы ад цэнтральных органаў і канчаючы мясцовымі ячэйкамі.

На трыбуне сакратар ЦК КП(б)Б т. ГЕЙ.

Дэлегаты зьезду зьяўляюцца прадстаўнікамі ўсёй рабселькораўскай масы БССР, якая зьяўляецца сустаўной часткай усяго рабселькораўскага руху СССР і сустаўной часткай рабселькораўскага руху ўсяго сьвету. Калі пралетарыят Савецкага Саюзу зьяўляецца ўдарнай брыгадай сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, дык мы, работнікі пралетарскага друку, мы, удзельнікі рабселькораўскага руху, павінны быць у першых радох гэтай ударнай брыгады. Мы павінны быць усе ўдарнікамі, мы павінны весьці барацьбу за тое, каб кожны ўдарнік быў у нашых радох.

Таварышы, наш другі зьезд супадае з гадавінай 11-га ліпеня—гадавінай вызваленьня Беларусі ад белапольскай акупацыі. Мне здаецца, што ў гэты дзень мы павінны паслаць самае гарачае прывітаньне нашым братом па клясе—рабоча-сялянскім масам фашысцкай Польшчы, якія вядуць непрымірымую барацьбу за зьнішчэньне фашысцкай дыктатуры ў Польшчы, за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне ўсіх прынечаных барацьбітоў за савецкую Польшчу.

Дзесяць год БДУ--дзесяць год

барацьбы за культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу

Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту

У дзень дзесяцігодзьдзя шлю прывітаньне ўсім студэнтам Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і яго работнікам.

Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт—дзіця Кастрычніцкай рэвалюцыі. У яго посьпехах адлюстроўваюцца посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, ленінскай нацыянальнай палітыкі культурнай рэвалюцыі ў БССР.

Савецкая Баларусь уся ахоплена працэсам вялізарнейшай перабудовы, творчай работай, сацыялістычнай рэканструкцыяй яе гаспадаркі, уздымам яе культуры. Расьце сацыялістычная індустрыя, колькасна, культурна і палітычна расьце пралетарыят БССР. На месцы драбнейшых і дробных гаспадарак, якія забясьпечвалі толькі паўгаладнае, паўжабрацкае існаваньне сялянина,—бурна растуць, ня гледзячы на шалёнае, але безрэзультатнае супраціўленьне кулацтва—калгасы, якія з першых-жа крокаў даюць уздым вытворчых сіл і матар'яльнага узроўню бедняка і серадняка. На месцы магнацкіх маёнткаў растуць нашы дзяжоўныя фабрыкі зерня, гародніны, мяса лёну.

Развіваецца беларуская культура, пралетарская па зьмесьце і нацыянальная па форме. Гэты культурны рост і ўздым Савецкай Беларусі відаць у школе, у газэтах, у літаратуры і ў разьвіцьці навуковай работы. Савецкая Беларусь—адзін з бліскучых узораў сусьветна-гістарычнага значэньня перамог ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Уздым Савецкай Беларусі на сацыялістычным шляху—простая працілегласьць гаспадарчаму развалу, клясаваму і нацыянальнаму прыгнечаньню, які панае ў Заходняй Беларусі.

Толькі дыктатура рабочай клясы, толькі ленінская нацыянальная палітыка, толькі сапраўднае бальшавіцкае кіраўніцтва нашай партыі на чале з яе правадыром тав. Сталіным, для эканамічна і культурна раней адсталай краіны, забясьпечыла высокія тэмпы ўзыму гаспадаркі і культуры на шляху сацыялізму.

У разьвіцьці і ўмацаваньні БДУ адлюстроўваецца гэты шматбаковы працэс сацыялістычнага росту БССР. Не выпадкова, што на арэне БДУ нацыянал-дэмакраты і расійскія шавіністы імкнуліся змагацца супроць КП(б)Б, за свае кадры. Посьпехі і ўмацаваньне БДУ, як адна частка ўсяго працэсу са цыялістычнага будаўніцтва БССР, асноваць на тым, што Камуністычная Партыя Бальшавікоў Беларусі пад кіраўніцтвам свайго ЦК, ва ўмовах вострай клясавай барацьбы вяла і праводзіць далей на справе ленінскую палітыку УсеКП(б) вяла і вядзе дасьціпную барацьбу супроць правага і «левага» апартунізму супроць расійскага шавінізму і нацыянал-дэмакратызму.

БДУ рыхтуе з рабочых, калгасьнікаў, бедняковай і сераднякоў новыя кадры работнікаў, арганізатараў і кіраўнікоў гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэтыя кадры выкоўваюцца зараз у абставінах пэрыяду сацыялізму.

Гэтыя кадры рыхтуюцца да таго, каб у бліжэйшыя гады перайсьці ад пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі да пабудовы сацыялізму, сумесна з усёй партыяй з усёй рабочай клясай СССР.

Самае гарачае прывітаньне новым пралетарскім кадрам, будаўніком сацыялізму, новым кадрам барацьбітоў за сусьветную перамогу камунізму.

З камуністычным прывітаньнем

А. КРЫНІЦКІ.

Галоўны корпус Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. У авале рэктар БДУ тав. Каранеўскі.

Прывітаньне Наркамасьветы РСФСР

Наркому Асьветы тав. Платуну

Вітаю працоўных Беларусі, студэнтаў, навуковых працаўнікоў з дзесяцігодзьдзем унівэрсытэту. Створаны ў пэрыяд разрухі, дзесяць год таму назад, Унівэрсытэт стаў культурным навуковым цэнтрам БССР. У абставінах разгорнутага сацыялістычнага наступу і клясавай барацьбы апошніх год унівэрсытэт узмацніўся як авангард у барацьбе за беларускую культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьместу. Жадаю посьпеха ў далейшай рабоце па ўзмацненьні кузьні пралетарскіх спэцыялістаў Савецкай Беларусі.

Наркамасьветы РСФСР БУБНОЎ.

10-гадовы юбілей вышэйшай школы—

сьвята ўсіх працоўных БССР

Вітаю працоўных БССР са сьвятам вышэйшай школы БССР. За гэтыя дзесяць год вышэйшая школа БССР стварыла новы малады актыў энтузіястаў будаўнікоў сацыялізму, унесла кштоўны ўклад у нацыянальную па форме і сацыялістычную па сутнасьці культуру БССР, залячыла раны нанесеныя культуры БССР падняволеньнем царскага самаўладзтва. Перажываная намі эпоха найвялікшага сацыялістычнага будаўніцтва патрабуючы новыя тысячы кваліфікаваных кадраў ставіць перад вышэйшай школай БССР новыя адказныя задачы, якія не сумняваюся, яна выканае з гонарам бальшавіцкімі тэмпамі пад кіраўніцтвам УсеКП(б) і яе ленінскага ЦК.

ЕНУКІДЗЭ.

Азэрбайджанскі Педагагічны Інстытут

—Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту

Азэрбайджанскі вышэйшы педагагічны інстытут імя Леніна шле гарачае прывітаньне Беларускаму Дзяржаўнаму Унівэрсытэту з дзесяцігадовым існаваньнем. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт зьяўляецца навочным доказам правільнасьці ленінскай нацыянальнай палітыкі, у справе будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьместу. Няхай жыве і кыве Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт.

Азэрбайджанскі Вышэйшы Педагагічны Інстытут.

Падрыхтоўку кадраў—у нагу з тэмпамі

сацыялістычнага будаўніцтва

Прэзыдыум Цэнтральнага Савету Прафсаюзаў Беларусі шчыра вітае Вышэйшыя Навучальныя Установы БССР, партыйныя, гаспадарчыя, педагагічныя, студэнцкія і прафэсыянальныя арганізацыі іх з 10-цігодзьдзем Вышэйшай Школы БССР, якая ўтварылася і разьвілася толькі дзякуючы Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, у барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнейшай небясьпекай на даным этапе, з контрэволюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі усіх колераў пралетарыят Савецкай Беларусі, пры брацкай дапмозе Савецкага Саюзу стварыў Вышэйшую школу—кузьню пралетарскіх кадраў для нашае сацыялістычнае прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу.

Перад Вышэйшай Школай БССР стаяць адказьнейшыя задачы закончыць поўны паварот Вышэйшай Школы на службу гігантцкі растучай сацыялістычнае гаспадарцы, разьвіць тэмпы падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў у адпаведнасьці з задачамі і тэмпамі ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва, ашчэ шчыльней зьвязаць Вышэйшую Школу з заводамі і фабрыкамі.

Прэзыдыум ЦСПСБ упэўнены, што на разьвязаньне гэтых задач будзе накіравана ўся воля і сілы ўсіх арганізацый Вышэйшай Школы.

Прэзыдыум ЦСПСБ.

Выклікаем „Новы Шлях"

Калгас «Луч Сацыялізму» Астрашыцка-Гарадзецкага сельсавету, Менскага прыгараднага раёну, разьмясьціў кантрольную лічбу пазыкі «3-ці рашаючы» (2-га выпуску пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады») на 313,5 проц цэнтаў і выклікае на сацспаборніцтва суседні калгас «Новы Шлях», таго-ж сельсавету.

Абвясьцілі сябе ўдарнікамі

Калгасьнікі калгасу «Молатаў», Чачэрскага раёну, падпісаліся на пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі» на суму 1.075 руб. Падпіска працягваецца.

Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і выклікалі калгас «Ударнік» на сацспаборніцтва.

А. Р.

Учора на зьезьдзе

Раньнішняе паседжаньне адкрывае тав. Дунец. Слова для дакладу аб рабселькораўскім руху, партыкіраўніцтве і ўдарніцтве ў друку атрымлівае рэдактар ЦО ЦК КП(б)Б «Зьвязды» тав. Будзінскі, зьяўленьне якога на трыбуну зьезд сустракае доўгімі воплескамі.

Наш друк неадлучны ад зашай партыі. Пачынаючы з гадпольнага пэрыяду наш друк быў найбольш сапраўдным сродкам узбудзэйнічаньня мас, прапаганды ідэй нашай партыі, і арганізацыі мас.

Наш бальшавіцкі друк заўсёды быў друкам рабочай клясы і робіцца рабочымі рукамі.

Тав. Будзінскі далей падрабязна спыняецца на розьніцы паміж нашым друкам і друкам буржуазным і сацыял-фашысцкім, апошнія зьяўляюцца вораганамі рабочае клясы. Ня менш увагі тав. Будзінскі аддае ў дакладзе пытаньню так званай «свабоды друку» ў буржуазных краінах. Гэта «свабода» накіравана на тое, каб затуманіць масы рабочых, каб адцягнуць увагу рабочай масы ад клясавай барацьбы.

Аб «свабодзе» слова і друку ў буржуазных краінах гаворыць яскрава той факт, што толькі на працягу 1927 году сялянская нацыянал-вызваленчая газэта Заходняй Беларусі 17 разоў зьмяняла сваю назву, 17 разоў яе закрывалі і 17 чалавек атрымалі ад ½ да 3 год турмы.

Армія рабселькораў—кажа тав. Будзінскі,—павінна карэнным чынам перабудаваць сваю работу пад пунктам погляду барацьбы за забясьпечаньне поўнага і своечасовага выкананьня ўсіх задач, якія перад намі стаяць у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.



Ударнікі Гомельскага дэпо адраманцавалі паравоз у падарунак зьезду.
На здымку: машыніст ЛЕБЕДЗЕЎ, пам. маш ЖЫЎЛА, качагар КРОТ.

На даным этапе рабселькор павінен быць перадавіком у радох барацьбітоў, павінен быць арганізатарам барацьбы за выкананьне задач партыі.

Вядучым зьвяном рабселькораўскага руху павінна быць брыгада друку, увесь рабселькораўскі рух павінен быць пераведзены на рэйкі калектыўнай работы, але разам з тым мы не павінны ўпускаць з поля зроку рабселькора-адзіночку. Рабселькора-адзіночку трэба прыцягваць да калектыўнай работы, узьнімаць яго на вышэйшую ступень.

У заключэньне свайго дакладу тав. Будзінскі заяўляе.

Мы бязумоўна рабселькораўскі рух зробім тым, чым хоча яго зрабіць партыя—найбольш поўным, найбольшым дзейсным дапаможнікам партыі ў справе сацбудаўніцтва.

Зьезд прыняў прапанову аб вынясеньні рэзалюцыі-пратэсту супроць закрыцьця газэты «Ротэ Фанэ».

Прынята прапанова паслаць дэлегацыю на адкрыцьцё лягеру «Чырвонай Рошча».

Пасьля кароткага перапынку з вялікім дакладам выступіў загадчык сэктарам друку культпропу ЦК КП(б)Б тав. Курцік.

На раніцнім паседжаньні з прывітаньнем зьезду выступіў рэктар БДУ тав. Каранеўскі. Зьезд вылучыў дэлегацыю для ўдзелу ва ўрачыстым паседжаньні, якое прысьвечваецца дзесяцігодзьдзю БДУ.

У заключэньне раніцняга паседжаньня была зачытана прывітальная тэлеграма «Крестьянской Газеты». Зьезд прыняў пастанову аб уключэньні ва ўсесаюзны конкурс «Крестьянской Газеты» на лепшы ўдзел ва ўборцы ўраджаю і хлебазагатовак. Зьезд выклікаў на сацспаборніцтва па гэтым пытаньні рабселькораў Заходняй вобласьці РСФСР.

На вячэрнім паседжаньні з прывітаньнем ад ЦК УсеКП(б) выступіў загадчык сэктару друку ЦК УсеКП(б) тав. Гусеў, які больш чым гадзінным выступленьнем абмляваў тыя задачы, якія стаяць перад бальшавіцкім друкам і рабселькорамі.

Ад рэдакцыі ЦО «Правда» і «Рабселькор» з прывітаньнем выступіў тав. Ярмілаў.

На вячэрнім паседжаньні пачаліся спрэчкі, у спрэчках запісалася больш 60 дэлегатаў. Пасьпелі выказацца т.т. Лазарэнка (калгас «Барацьбіт», Шклоўскі раён), Нікалаева (фабрыка «Дзьвіна»), дэлегат Гомельскага заводу «Пралетары».

На вячэрнім паседжаньні з прывітаньнем выступалі дэлегацыя МОПР'у дэлегацыя рабочых шчотачнай фабрыкі імя Крупскай, спэцыялістаў ВСНГБ, аб'яднанай Беларускай вайсковай школы.

Сёньня на раніцнім паседжаньні будуць працягвацца спрэчкі па дакладах тав. Будзінскага і тав. Курціка.

Пастанова пленуму ЦК КП(б)Б

аб выкананьні прамфінпляну па БССР за першае паўгодзьдзе 1931 году

1. Выкананьне пляну па прамысловасьці БССР за першае паўгодзьдзе 3-га рашаючага году пяцігодкі паказвае далейшыя дасягненьні ў справе сацыялістычнай індустрыялізацыі БССР.

За першае паўгодзьдзе прамысловасьць ВСНГ дала прырост валавой прадукцыі ў параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году ў зьменных цэнах 1926-27 г. на 35% і па Наркамснабе—на 33,7 проц.

Аднак, вынік выкананьня прамфінпляну за 5 месяцаў 3-га рашаючага году пяцігодкі (студзень—май 1931 г.) зьяўляюцца нездавальняючымі. Плянавае заданьне па выпуску прадукцыі прамысловасьці ВСНГ выканана на 85,1 проц., у тым ліку па групе «А»—57,3 проц. і па групе — «Б»—95,4 проц. Па прамысловасьці Наркамснабу выкананьне плянавых заданьняў за тыя-ж 5 месяцаў складае 77,6 проц. У выніку гэтага склалася запазычанасьць па выкананьні прамфінпляну па прамысловасьці ВСНГ ў суме 19.078 тыс. руб. і па прамысловасьці Наркамснабу —7.545 тыс. руб.

ЦК лічыць асабліва недапушчальным і пагражаючым становішча ў выкананьні прамфінпляну па такіх галінах, як мэталапрацоўчая і асабліва па сэзонных галінах прамысловасьці, якія грунтуюцца на мясцовай сыравіне (торф, будаўнічыя матар'ялы, фасфарытныя распрацоўкі).

Прычынамі гэтага недавыкананьня прамфінпляну зьяўляюцца: слабае кіраўніцтва гаспадарчых арганізацый, недапушчальна павольная перабудова на новыя формы і мэтады кіраваньня прамысловасьцю, фармальнае правядзеньне гаспадарчага разьліку на большасьці прадпрыемстваў і галіны прамысловасьці, неперабудаванае партыйна-масавай і прафсаюзнай работы на прадпрыемствах, неналаджанасьць унутрызаводзкага плянаваньня, а таксама недапушчальная недаацэнка з боку большасьці гарадзкіх і раённых камітэтаў партыі, РВК і гарадзкіх саветаў значэньня выкананьня прамфінпляну. У выніку ўсяго гэтага стварылася дрэннае забясьпечаньне рабочай сілаю, слабая арганізацыя рабочай сілы і слабае яе выкарыстаньне.

Меўшыя месца перабоі ў забясьпечаньні сыраўнаю патрабавалі і патрабуюць ад усіх гаспадарчых, прафсаюзных і партыйных арганізацый максымальнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і лепшага выкарыстаньня сыравіны. Аднак, гэта справа ў шмат якіх выпадках не праведзена, рад гаспадар нікаў прафсыяналістаў і партыйных работнікаў спасаваў перад цяжкасьцямі, спасылаючыся на «аб'ектыўныя» прычыны ,што пленум ЦК расцэньвае як праяву правага апартунізму.

2. Падкрэсьліваючы рэальнасьць пляну і наяўнасьць усіх магчымасьцяй для яго выкананьня і перавыкананьня, аб чым сьведчыць пасьпяховае барацьба ад прадпрыемстваў, паказаўшых сапраўды большавіцкія ўзоры працы (Магілёўская друкарня—118%, Якаўлевіцкая суконная фабрыка—103 проц., Гомельскі скурзавод—107,7 проц., «Бальшавік»—102,8 проц., швейная фабрыка «Кастрычнік»—105,2 проц., швейная імя Валадарскага—110,8 проц., Віцебская воласапрадзільная — 128,8 проц.)—ЦК КП(б)Б высоўвае перад усімі партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі адказную задачу—дабіцца неадкладнага рашучага пералому ў працы прамысловасьці і пераарыць стварыўшуюся за першыя 5 месяцаў гэтага году запазычанасьць па выкананьні прамфінпляну.

3. Ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б а перабудове партыйнай, прафсаюзнай і гаспадарчай работы і перабудове партыйнае работы на падставе рашэньняў ЦК УсеКП(б) ад 21-III 1931 г. завяршыць у месячны тэрмін, забясьпечыўшы праўільную расстаноўку партыйных сіл і лепшых ударнікаў на больш баявых і рашаючых участках прадпрыемстваў.

Адзначаючы некаторае паслабленьне ўвагі партыйных арганізацый да справы сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, аб чым сьведчыць невыстарчальны ўдзел партыйцаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве (па 44-х прадпрыемствах БССР удзел партыйцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве складае 70,2 проц. камсамольцаў—74,4 проц.), ЦК КП(б)Б прапануе партыйным арганізацыям і ЦК ЛКСМБ забясьпечыць неадкладны 100-процантны ахоп партыйцаў і камсамольцаў ударніцкім рухам.

4. Канстантуючы шырокі рух рабочых мас у справе ажыцьцяўленьня лёзунгу партыі аб аўладаньні тэхнікай пленум адзначае што ў гэтым пытаньні маюцца неразуменьні і скажэньні, якія вытыўляюцца ў тым, што ўся ўвага накіроўваецца толькі на тэхнічную вучобу, на разгортаньне гурткоў. Пленум падкрэсьлівае ,што правільнае вырашэньне праблемы аўладаньня тэхнікай у першую чаргу заключаецца ў тым, каб паставіць у цэнтры ўвагі вырашэньне тэхнічных праблем, якія адыгрываюць рашаючую ролю на прадпрыемстве, у цэху і брыгадзе, як у сучасным таксама і ў пэрспэктыўным разьвіцьці. Побач з гэтым ЦК прапануе як бліжэйшае мерапрыемствы па ажыцьцяўленьні гэтага лёзунгу, разгарнуць шырокую работу па ліквідацыі тэхнічнай непісьменнасьці з тэкім разьлікам, каб у наступным годзе ахапіць тэхнічнай вучобай розных ступеняй ня менш 50 проц. усіх рабочых.

Абавязаць БД Выдавецтва выдаць і наладзіць выпуск масавай тэхнічнай літаратуры не пазьней верасьня месяца.

Даручыць Культпропу ЦК у месячны тэрмін распрацаваць пытаньне аб увядзеньні элемэнтаў тэхнічнай асьветы ў парт., праф. і КСМ вучобу, а таксама ў праграму навучальных устаноў НКА.

Фракцыі ЦСПСБ правесьці шырокую работу па тэхнічнай вучобе ўдарнікаў на прадпрыемствах.

5. Бязьлітасная барацьба з фармальным ажыцьцяўленьнем гаспадарчага разьліку ў цэхах, сканчэньне сапраўднага пераводу цэхаў на гаспадарчы разьлік пры актыўным удзеле шырокай рабочай грамадзкасьці павінны быць узяты на працягу бліжэйшага часу пад асаблівы кантроль гарадзкіх і раённых партыйных арганізацый. Уся работа ў трэцім квартале павінна праходзіць ва ўмовах поўнага ўкараненьня гаспадарчага разьліку і скарыстаньня яго як рычага кантролю рублём кожнага вучастку прадпрыемства і ператварэньне яго ў сапраўдную зброю барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Не затрымліваючыся пры пераводзе на гаспадарчы разьлік паасобных цэхаў прапрыемства, разгарнуць шырока масавую работу сярод рабочых па пераводзе на гаспадарчы разьлік брыгад на прыкладзе прадпрыемстваў Ленінграду і Масквы.

6. Пленум адначае зусім дрэнную пастаноўку тарыфнай работы на прадпрыемствах, што ў асноўным сьцьвярджаецца ўжываньнем значнай колькасьці розных сыстэм аплаты на адным і тым-жа прадпрыемстве, асабліва ўжываньнем сыстэмы аплаты з гадзіны (пагадзінай), замест простай зьдельшчыны, правядзеньнем практыкі ўраўнілаўкі па паасобных прадпрыемствах, дрэнная пастаноўкі работы ТНБ на прадпрыемствах. Ня рэдкі выпадкі, калі кваліфікаваных рабочых аплачваюцца ніжэй за чорнарабочых, што зьнішчае ўсякую зацікаўленасьць рабочых да павялічэньня прадукцыйнасьці працы і падвышэньня кваліфікацыі.

Адначасова з гэтым пленум канстатуе, што праведзеная кампанія па аглядзе норм і расцэнак далёка не дала належных вынікаў па зьнішчэньні адзначаных вышэй сур'ёзных недахопаў у справе нармаваньня прадукцыйнасьці працы і рэгуляваньня зарплаты.

Пленум ЦК катэгарычна прапануе усім партыйным, гаспадарчым і прафарганізацыям рашуча пашырыць сыстэму зьдельнай і інш. заахвочваючых форм аплаты, якія стымулююць бязьперапынны рост прадукцыйнасьці працы, палепшаньне якасьці прадукцыі і зацікаўленасьць рабочых у падняцьці кваліфікацыі.

Пленум ЦК даручае ВСНГ, НК Працы, НКСнабу сумесна з ЦСПСБ прыступіць да шырокага вывучэньня ўсіх форм зьдельшчыны (простая неабмежаваная прагрэсыўна-прэміяльная, індывідуальная і калектыўная) іх уплыў на прадукцыйнасьць працы з тым, каб даць канкрэтныя паказаньні мясцом аб прыняцьці найлепшых форм аплаты працы, сурова праводзячы палітыку лепшага забясьпечаньня вядучых прафэсій асноўных груп рабочых ударнікаў прадпрыемства.

7. У справе арганізацыі вытворчых камун меў месца рад перагібаў і скажэньняў. У той час, калі вытворча-бытавыя камуны, якія арганізуюцца па ініцыятыве саміх рабочых, зьяўляюцца першым зачаткам сапраўды камуністычных форм працы, і вопыт гэтых камун патрабуе уважлівага вывучэньня , на нарадзе прадпрыемстваў былі створаны вытворчыя камуны без неабходнай папярэдняй падрыхтоўкі, што прывяло фактычна да прапіненьня на прадпрыемствы ўраўнілаўкі ў заработнай плаце пад сьцягам вытворчай камуны і павяло ў радзе выпадкаў да зьнижэньня прадукцыйнасьці працы.

Пленум ЦК абавязвае ўсе партыйныя і гаспадарчыя органы павесьці рашучую барацьбу з «абязьлічкай» у вытворчай працы, а таксама палепшыць і наблізіць да рабочага неабходныя струманты, прыклады і г. д.

Увядзеньне сталых зьмен, сталага складу брыгад, дакладнай пэрсанальнай адказнасьці за выконваную работу, прымацаваньне работнікаў да сталых варштатаў і сродкаў вытворчасьці, зьяўляецца першачарговымі мерапрыемствамі, якія павінны быць зьдзейсьнены на кожным прадпрыемстве.

8. Побач з недахопам рабочай сілы па радзе вядучых галін прамысловасьці (тарфяная, будаўнічая, лясная і інш.), што галоўным чынам тлумачыцца дрэннай пастаноўкай вярбоўкі рабочай сілы, яе падрыхтоўкай, замацаваньне рабочых за прадпрыемствамі і нездавальняючым іх культурна-бытавым абслугоўваньнем, а таксама нездавальняючым скарыстаньнем па большасьці прадпрыемстваў наяўнай рабочай сілы, па паасобных прадпрыемствах усё яшчэ маюцца значныя лішкі рабочае сілы. Пленум ЦК прапануе гаспадарчым органам карэнным чынам перабудаваць сыстэму вярбоўкі кадраў, шырока скарыстоўваючы на дагаворных падставах рабсілу калгасаў, і прыняць рашучыя захады да палепшаньня культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Пленум ЦК лічыць неабходным каб кожнае прадпрыемства паставіла работу па падрыхтоўцы кадраў у цэнтры ўвагі, дабіўшыся поўнага скарыстаньня рабочых рэзэрваў для арганізацыі сталых кадраў прадпрыемства, асабліва членаў сямей рабочых, калгасьнікаў бліжэйшых калгасаў і г. д.

З мэтаю стымуляваньня лепшага замацаваньня рабочых за прадпрыемствамі, неабходна наладзіць работу па перакваліфікацыі і дакваліфікацыі рабочых.

Адначасова з гэтым пленум рашуча прапануе ўсім гаспадарчым арганізацыям безадкладна давесьці колькасьць рабсілы на прадпрыемствах у поўнай адпаведнасьці з выкананьнем вытворчага плану, даручыўшы ВСНГ, НДПрацы і ЦСПСБ устанавіць сыстэматычны кантроль за правядзеньнем гэтага ў жыцьцё.

9. Даручыць Белкалгасцэнтру, НКПрацы, ВСНГ і інш. гаспадарчым арганізацыям на працягу 10 дзён распрацаваць практычныя мерапрыемствы, якія выцякаюць з апублікаванага дэкрэту ЦВК і СНК СССР аб адходніцтве, шырока папулярызаваць гэтыя мерапрыемствы сярод калгасьнікаў, галоўным чынам зьвярнуць увагу на пытаньні аказаньня гаспадарчай дапамогі такім калгасам, якія даюць для сацыялістычнай прамысловасьці найбольшую колькасьць рабочых і ў найбольш кароткі тэрмін.

10. Ганебнае становішча са зьнижэньнем сабекошту сьведчыць аб невыкананьні заводзкімі арганізацыямі вызначанага ВСНГ пляну рацыяналізатарскіх работ. Надаючы правядзеньню рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў важнейшае значэньне для зьнижэньня сабекошту і выкананьня якасных паказьнікаў, пляну, пленум ЦК даручае ВСНГ і НКСнабу забясьпечыць неабходнымі матар'ялямі і фінансавымі сродкамі ажыцьцяўленьне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, ужыўшы захады далейшага ўзмацненьня рацыяналізатарскіх арганаў найбольш кваліфікаваным кадрамі. Уся рацыяналізатарская работа павінна быць пастаўлена на масавыя рэйкі шырокага ўцягненьня ўсяго рабочага калектыву і скарыстаньня рабочай ініцыятывы ў справе палепшаньня вытворчасьці і мабілізацыі ўсіх унутраных рэсурсаў. Рашуча палепшыць справу рэалізацыі рабочага вынаходніцтва і прапаноў.

11. Невыкананьне плянавага заданьня па зьнижэньні сабекошту патрабуе скансцентраваньня ўсёй работы на максымальным зьмяншэньні выдаткаў вытворчасьці, лепшым скарыстаньнем матар'ялаў рабочай сілы і грашовых рэсурсаў. Гэтая работа павінна стаць баявым вучасткам работы ўсіх арганізацый заводу. Штомесячныя калькуляцыі павінны стаць справаю сваячасовага і дэталёвага аналізу ўсяго заводзкага актыву і служыць зброяй для неадкладнага зьнішчэньня ўсіх недахопаў і слабых месц у рабоце прадпрыемстваў.

12. Адзначаючы адсутнасьць належнага палепшаньня якасьці прадукцыі, ненармальна высокі ў апошні час процант браку, асабліва па экспартнай прадукцыі, пленум ЦК побач з задачамі зьнижэньня сабекошту абавязвае ўсе гаспадарчыя і прафсаюзныя арганізацыі, а таксама партыйныя ячэйкі дабіцца ў бліжэйшы час рашучага пералому ў справе палепшаньня якасьці прадукцыі, падвышэньня гатункаў і зьмяншэньня браку.

13. Улічваючы рашаючае значэньне ў справе выкананьня прамфінпляну, узмацненьне тэхнічнага кіраўніцтва, яго канкрэтызацыю і палепшаньне арганізацыі плянаваньня, асабліва ўнутры-заводзкага, гаспадарчым арганізацыям дабіцца на працягу бліжэйшага часу наблізжэньня тэхнічнага кіраўніцтва да цэху, брыгады і варштату, у першую чаргу дабіцца палепшаньня тэхнічнага кіраўніцтва ў цячэрнія і начныя зьмены, давядзеньня колькасных і якасных паказальнікаў пляну ў форме канкрэтных працоўных заданьняў да паасобных брыгад і рабочых. Кіраўніцтва з боку аб'яднаньняў павінна быць рашуча перабудавана. Гаспадарчыя аб'яднаньні павінны быць гнуткімі, добра арганізаванымі, «хозрасчётнымі» адзінкамі, якія ажыцьцяўляюць непасрэднае канкрэтнае кіраўніцтва прадпрыемствамі. Кіраўнікі аб'яднаньняў павінны як мага часьцей бываць на прадпрыемстве, вывучаючы яго асаблівасьці, даходзячы да ўсіх дэталяй. У гэтым-жа напрамку павінна быць перабудавана кіраванье з боку заводакіраўніцтваў цэхамі. Аднэй з чарговых задач гаспадарчага кіраўніцтва пленум ЦК лічыць больш поўнае правядзеньне спэцыялізацыі прадпрыемстваў па пэўных відах і асартымэнтах прадукцыі.

Улічваючы цесную сувязь пытаньня выкананьня прамфінпляну з пытаньнем рабочага забясьпечаньня, жыльлёвага будаўніцтва і культурна-бытавага абслугоўваньня рабочых, пленум ЦК лічыць патрэбным паскорыць перабудовы работы спажывецкай кааперацыі ў першую чаргу далейшую арганізацыю і гаспадарчае замацаваньне існуючых ЗРК, разгортваньне дзейнасьці і наладжваньне грамадзкага харчаваньня. Пленум ЦК даручае ўсім раённым партарганізацыям неадкладна правесьці ход перабудовы сыстэмы спажыўкааперацыі на мясцох, дабіўшыся рашучага пералому ў гэтай справе. Пленум ЦК даручае Белкаапсаюзу ўзмацніць матар'яльна-фінансавую базу ЗРК і аб выкананьні далажыць бюро ЦК у 2-дзесяцідзённы тэрмін.

14. У асабліва небясьпечным становішчы знаходзіцца зараз тарфяная, цагельная і мясная прамысловасьць. Падкрэсьліваючы выключную важнасьць гэтых галін прамысловасьці для народнае гаспадаркі, пленум абавязвае усе райкомы КП(б)Б і РВК пад асабістую адказнасьць сакратароў РК і старшынь РВК прыняць усе захады да поўнага выкананьня плянаў па торфе і цэгле з такім разьлікам, каб торфсэзон скончыць да 15-га жніўня і цэглы—да 20 верасьня.

Для ліквідацыі прарываў па торфапрамысловасьць даручыць бюро ЦК мабілізаваць 25 членаў ЦК і для больш буйных цагельных заводаў 20 адказных працаўнікоў, якіх камандіраваць на прадпрыемства ў якасьці упаўнаважаных ЦК і СНК.

15. Улічаючы вялізарны прарыў па лесаэкспарце, ЦК абавязвае партарганізацыі ўжыць рашучыя захады да ліквідацыі прарываў, 100-процантнага выкананьня экспартнага пляну як па колькасных, так і па якасных паказьніках, для чаго:

а) ні ў якім разе не дапускаць перакідкі з лесаэкспортных фанэрных заводаў рабочых на іншыя прадпрыемствы;

б) прыняць тэрміновыя меры да поўнага ўкамплектаваньня лесаэкспартных заводаў патрэбнай рабочай сілай, прыняўшы меры да павялічэньня вытрацоўкі новых відаў прадукцыі для экспарту.

16. Асобныя галіны прамысловасьці НКСнабу, амаль што выключна працуючыя на мясцовай сыравіне, ня былі цалкам забясьпечаны гэтай сыравінай з ураджаю 1930 году. Спэцыялізацыя раёнаў дае магчымасьць разьвіцьця сыравіннай базы і гэтым самым поўнага забясьпечаньня ўраджаю 1931 году. Выкананьня плянавых заданьняў па даных галінах прамысловасьці, пленум ЦК КП(б)Б даручае СНК БССР у мэтах поўнага забясьпечаньня прамысловасьці НКСнабу, стварыць сталую сыравінную базу з разьвядзеньнем тэхнічнай бульбы з больш высокім процантам крухмальнасьці, замацаваць за гэтай прамысловасьцю сталую заводзкую зону, вызначыўшы аб'ём зоны для кожнага прадпрыемства.

Лічыцца з тым, што прамысловасьць НКСнабу займае значнае месца ў экспартным пляне, а выкананьне гэтага пляну праходзіць зусім нездавальняючы абавязаць НКСнаб узяць пад асобны нагляд прадпрыемствы, якія працуюць на экспарт, забясьпечыўшы іх цалкам сыравінай і павялічэньне тыпрадукцыі новых відаў прадукцыі для экспарту.

17. Адзначаючы нездавальняючае разгортваньне капітальнага будаўніцтва прамысловасьці, пленум ЦК у мэтах забясьпечаньня выкананьня праграмы 1930 году і падрыхтоўкі да разгортваньня прамысловасьці ў 1932 годзе, лічыць неабходным у бягучым годзе закончыць пабудову і ўвесьці ў дзейнасьць наступныя прадпрыемствы: Гомсельмаш, пэмантны завод у Крычаве, цыкляны завод у Гомлі, адэтонавы завод у Быхаве ,панчошна-трыкатажная фабрыка ў Віцебску, дрэваапрацоўчы камбінат у Гомелі, Гомельскі элеватар, маргарынавы завод, шчацінны камбінат у Віцебску, пачатую пабудову цэхаў дзеючых прадпрыемстваў («Энергія», «Камунар», «Пралетары», тры хлебных заводы і фабрыку-кухню).

Адначасова пленум ЦК даручае бюро ЦК прыняць канкрэтныя меры да ажыцьцяўленьня праграмы будаўніцтва ВТНУ ,школ фабзавучу і тэхніку маў, пабудова якіх ідзе зусім нездавальняюча. Для ліквідацыі прарыву і абавязкозага выкананьня ўсяго пляну будаўніцтва, пленум Цэнтральнага камітэту прапануе ўсім партыйным, прафэсыянальным, савецкіх арганізацыям і друку ліпень месяц скарыстаць як месяц рэзкага пералому ў справе разгортваньня будаўніцтва і вытворчасьці будматар'ялаў (цэгла, вапна) і ліквідацыі прарываў, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на:

а) скарыстаньне мясцовых матар'ялаў замест дэфіцытных, эканомнае выдаткаваньне іх;

б) поўнае выкананьне дэкрэта ЦВК СССР ад 30-VI г. г. аб адходніцтве, дамагчыся ў бліжэйшыя некалькі дзён азнаямленьня з гэтым дэкрэтам усіх калгасьнікаў, беднякоў і серадняковёскі;

в) падвышэньне прадукцыйнасьці працы, правільнай арганізацыі яе, ліквідацыі ўраўнілаўкі ў зарплаце;

г) рацыянальна поўнае скарыстаньне механізмаў, ліквідацыю абязьлічкі, поўнае і сапраўднае правядзеньне гаспадарчага разрахунку на ўсіх будоўлях—мабілізаваўшы для выкананьня гэтай задачы ўсе сілы рабочай і калгаснай грамадзкасьці, у першую чаргу пастаноў па новым кіраўніцтве будаўніцтвам і шырока разгортваючы масавую работу сярод рабочых будаўнікоў і заводаў, вырабляючых будматар'ялы даючы рашучы адпор усім апартуністычным гутаркам аб нерэальнасьці пляну.

18. Становішча з паливазабясьпечаньнем пагражаючае, труднасьці ў гэтай галіне зьяўляюцца вынікам недавыкананьня плянаў торфаздабычы і лесазагатовак у 1930 годзе, зусім нездавальняючага торфсэзону і лесазагатовак у бягучым годзе, а таксама шкодніцтва, меўшага месца ў апалавай прамысловасьці.

Зусім нездавальняюча праводзіцца дырэктыва партыі і ўраду аб эканоміі апалу.

Бальшавіцкае вырашэньне апалавай праблемы зьяўляецца абавязковай умовай забясьпечаньня пасьпяховага выкананьня ўсяго народна-гаспадарчага пляну 1931 году. Ухваляючы рашэньне бюро ЦК ад 23-га чэрвеня 1931 году аб торфадрэнажагатоўках, пленум абавязвае ўсе партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі прыняць самыя рашучыя захады да поўнага правядзеньня ў жыцьцё гэтай пастановы.

19. Пленум ЦК КП(б)Б лічыць неабходным у мэтах забясьпечаньня ўдарнага будаўніцтва і скančэньня пачатага будаўніцтва ў мінулым годзе, якое не патрабуе значнай колькасьці дэфіцытных матар'ялаў, забясьпечыць гэтыя аб'екты ўсімі матар'яламі, ня спыняючыся перад перакідкай матар'ялаў з няўдарных аб'ектаў на ўдарныя. Асаблівую ўвагу партарганізацыі пленум лічыць неабходным зьвярнуць на садзейнічаньне ўсім відам спэцыяльнага будаўніцтва, поўнае і 100-процантнае выкананьне якога зьяўляецца справай гонару ўсёй КП(б)Б.

20. Пленум ЦК адзначае усё яшчэ нездавальняючае правядзеньне адзінаначальля ў прамысловасьці, асабліва на прадпрыемствах, няўменьне з боку гаспадарнікаў выкарыстоўваць прадастаўленьня ім правы. У сувязі з гэтым гаспадарнікі ня могуць правільна ацаладаць і кіраваць даручанай гаспадаркай. З боку партыйных і прафэсыянальных арганізацый яшчэ ня прыняты дастатковыя меры для сапраўднага правядзеньня адзінаначальля, зьнішчэньня маючагася тузаньня адміністрацыйна-тэхнічных працаўнікоў. Пленум даручае ўсім партыйным, савецкім, гаспадарчым і прафэсыянальным арганізацыям стварыць вакол дырэктароў і тэхнічнага пэрсаналу такія ўмовы, пры якіх яны маглі б ажыцьцяўляць свае правы, якія вынікаюць з палажэньняў аб адзінаначальлі, праяўляць ініцыятыву і вытворчую рызыку, праводзячы ўсю гэтую работу пры ўдзеле шырокіх мас рабочых данага прадпрыемства, вытворчых нарад, ударных брыгад і г. д.

21. Пленум ЦК прапануе кіравацца наступнымі паказаньнямі ў пытаньні аб спэцыялістах: «нельга да спэцыялістаў падыходзіць з меркаю 1928 году. Шмат старых спэцыялістаў тады і ў наступныя гады хістаціся. Цяпер становішча іншае. Шкодніцкія арганізацыі разгромлены. З калгасамі і саўгасамі справа вышла. Большасьць старых спэцыялістаў пераканалася, што пяцігодка не фантазія. Яны ня могуць таксама не задумляцца і над фактам умацаваньня нашага міжнароднага становішча. Зразумела, дзе-ні-дзе яшчэ існуе шкодніцтва. Але большасьць старой тэхнічнай інтэлігенцыі паварочваецца да нас і будзе прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве Мы павінны дапамагаць нашым інжынэрна-тэхнічным працаўнікам. Трэба стварыць такія абставіны, каб людзі маглі творча працаваць, праяўляць максімум ініцыятывы, каб інжынэры не баяліся пайсьці на тэхнічную рызыку, калі гэта патрэбна. Усё гэта будзе спрыяць ліквідацыі алставаньня на радзе важнейшых вучасткаў сацыялістычнай будоўлі» («Правда», № 175, ад 27-га чэрвеня 1931 году).

22. Нармальная работа прадпрыемстваў часта парушаецца абсьледваньскай гарачкай, напшывам розных брыгад, камісій г. д. Пленум ЦК прапануе ЦКК-РСІ ўжыць рашучыя захады да ўрэгуляваньня гэтага пытаньня і абаранць прадпрыемствы ад раду выпадкаў лішняга ўмяшаньня ў іх работу.

23. Ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну патрабуе яшчэ большага ўкараненьня камуністычных форм працы, скарыстаньня ўсё растучай вытворчай ініцыятывы рабочай клясы на выкананьне і перавыкананьне пляну 1931 г., перабудовы ўсёй прафсаюзнай работы ў напрамку арганізацыі шырокіх мас на барацьбу за прамфінплян.

У БОЙ ЗА ТОРФ

Дзённая зводка

здабываньня торфу па найбольш буйных прадпрыемствах Белторфаб'яднаньня на 7-VII 31 г.

Назва заводаў	% выкананьня ў дзень пляну
1. Бальшавік	82,3
2. Грэбянёва	49,5
3. Давы-аўка	12,0
4. Закрашанскі Мох	80,8
5. Зьвязда	64,4
6. Чы воны Тарфяник	94,7
7. Чырвоная Беларусь	8,9
8. Чырвоны Сьяг	31.3
9. Калёктыўная Праца	12,4
10. Ленінскі Шлях	52,9
11. Новая Беларусь	17,6
12. 1-е Мая	109,4
13. Асінторф	38,3
14 Шлях Сацыялізму	40,8

Урачыстае пасяджэньне Менгарсавету

з удзелам гаркому КП(б)Б, гарпрафсавету і грамадзкіх арганізацый, прысьвечанае XI годзьдзю вызваленьня Беларусі ад белапалякаў

10 ліпеня г. г. а 8-й гадзіне ўвечары ў садзе Прафінтэрн адчыніўся аб'яднаны пленум Менгарсавету з ГК КП(б)Б, ЛКСМБ, ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і іншых грамадзкіх арганізацый прысьвечаны 11-й гадавіне вызваленьня БССР ад белапалякаў.

З уступнай прамовай пленум адчыніў старшыня Менгарсавету тав. Валодзька.

Ён у сваёй прамове адзначыў тыя посьпехі БССР, з якімі яна сьвяткуе 11 год свайго вызваленьня з пад пяты польскага фашызму.

Па прапанове прэзыдыуму пленуму ўсе дэлегаты ўшаноўваюць уставаньнем памяць загінуўшых за вызваленьне БССР ад белапалякаў.

З вялікім дакладам аб выніках сацбудаўніцтва ў СССР і БССР выступіў нам. старшыні СНК БССР тав. Бэнэк.

Тав. Бэнэк у сваім дакладзе расказаў аб тых зьдзеках, якія панавалі на Беларусі ў часе белапольскай акупацыі.

Сярод вас ёсьць і тыя, што прымалі ўдзел у грамадзянскай вайне, у вайне з белапалякамі, яны помняць, што Беларусь была разбурана з Рэчыцы на Захад, з Барысава на Захад.

Тав. Бэнэк застанавіўся на тэй гераічнай барацьбе, якую вёў пралетарыят і дзякуючы чаму БССР была вызвелена ад усіх акупантаў.

Тав. Бэнэк у сваім дакладзе адзначыў той бурны рост прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, які ў БССР дасягнуў да 42 проц. калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

На вытворчасьці—кажа тав. Бэнэк,—у нас у БССР занята каля 100.000 рабочых, і маецца недахват каля 30—40 тысяч рабочых рук, у той час калі капіталістычныя дзяржавы залыхаюцца ад беспрацоўя.

Пленум віталі дэлегацыя № артыллерыйскай дывізіі і № стралковы Самарскай дывізіі, якія запэўнялі, што Чырвоная армія як трымала, так і надалей яшчэ мацней будзе трымаць у руках вінтоўку стоячы на абароне межаў СССР і ахоўваючы сацыялістычнае будаўніцтва.

А. З—к.

Многія перадавыя калгасы Барысаўшчыны скасілі і ўбралі большую палову сваёй сенажаці. Ва ўборцы значна адстае аднаасобны сэктар

Сенаўборачная кампанія поўнасьцю і ва ўсіх калгасах Барысаўскага раёну пачалася ў апошнія дні чэрвеня. Толькі аднаасобны сэктар значна пазьней выйшаў на сенажаць і мае куды меншыя паказьнікі. Гэты сэктар па сёньняшні дзень скасіў і ўбраў ня больш 8—10 проц. сваіх сенажацяй у той час, як сярэдні процант скошанага і ўбранага сена ў калгасах складае 25—30 проц.

Гэта тлумачыцца тым, што з аднаасобнікамі праводзілася слабая падрыхтоўка да сенаўборачнай. Сельсаветы слаба або зусім не кіравалі кампаніяй падрыхтоўкі да сенаўборкі. Шмат сельсаветаў зараз ня маюць нікіх вестак як праводзяць сенаўборку аднаасобнікі. Ёсьць скаргі, што не хапае **ўборачных машын: сенакасілак, конных** грабляў і нават кос. Імі не забясьпечаны поўнасьцю нават калгасы. Райкалгассаюз накіраваў па сельспажыўтаварыствах толькі 1.000 кос, а іх патрэбна куды больш. Сенакасілкамі не забясьпечана большасьць калгасаў. Некаторыя калгасы зараз пасылаюць дэлегацыі за пошукамі сенакасілак у іншыя раёны, бо ў Барысаве іх няма на складах.

Але ня ягледзячы на гэтыя недахопы, сенаўборачная кампанія праводзіць здавальняюча. Дзякуючы поўнаму ўвядзеньню зьдзельшчыны,—шырока разгорнутаму ўдарніцтву і сацспаборніцтву паміж калгасамі, ударнымі брыгадамі калгасьнікаў і асобнымі касцамі-калгасьнікамі шмат якія калгасы на сёньняшні дзень скасілі і ўбралі больш паловы сваіх сенажацяй Напрыклад, калгас «Чырвоная судонь» (Жыцькаўскі сельсавет) скасіў і ўбраў 65 проц. сваёй сенажаці, калгас «Пралетарская перамога»—60 проц. усёй сенажаці, «Чырвоныя Горкі»—58 проц., «Завет Ільіча»—50 проц., а нацыянальны польскі калгас «Домбаль» (Лазінскі с.-с.) скасіў і ўбраў 85 га сенажаці.

Пасьпяховае правядзеньне сенаўборкі, дысцыпліна і правільны вучот працы выклікалі вялікі прыліў у калгасы. Дзесяткі новых гаспадарак кожны дзень уліваюцца ў калгасныя рады.

Г. Корсін.

Ударыць па асобах, якія нядбайна адносяцца

да выпечкі і водпуску хлеба працоўным

Якасьць прадукцыі і палепшаньне грамадзкага харчаваньня рабочых і працоўных мас зьяўляецца першапачатковай задачай каапэрацыі.

Зробленая праверка Бюро Скаргаў ЦКК—НК РСІ Бел. хлебазаводу і хлебных крам МЦРК паказала, што гэтыя прадпрыемствы далёкі ад таго, каб задаволіць патрабаваньні рабочых і працоўных мас у справе абслугоўваньня іх харчаваньнем.

У шмат правераных хлебных крамах (№№ 151, 24, 121, 136 і г. д.) знойдзена, што хлеб прымаецца бяз вагі крамамі ад хлебазаводу. Такое становішча стварае недавагу хлеба пры водпуску рабочым і працоўным масам.

Зробленая праверка шляхам перавагі бахана хлеба ў крамах №№ 156, 145, 114, 201, 39, 35 і інш. паказала, што да нормы патрэбнай вагі ў буханках хлеба—2 кг. не хапае амаль што ў кожнай буханцы ад 50 да 150 грам у той час, калі з хлебазаводу гэтая-ж буханка адпускаецца за 2 кг.

Маецца шмат дрэннага хеба: гарэлы, чорствы, з пяском, нават з рабакамі. Такія нядбайныя адносіны як з боку асобных працаўнікоў на хлеба заводзе, так і паасобных працаўнікоў у крамах МЦРК павінны атрымаць рашучы адпор, трэба гэтаму паклясьці канец. За такія адносіны вінаватыя павінны панесьці пакараньне.

Крамныя каапкамісіі не працуюць. Кнігі скаргаў у большасьці крам не правяраюцца. Дапамога і кантроль у рабоце з боку праўленьня МЦРК у большасьці сваёй адсутнічае.

Адміністрацыі хлебазаводу і праўленьню МЦРК трэба прыняць усе захады і паклясьці канец недаважцы хлеба, наладзіць так водпуск хлеба, каб апошні прымаўся ад хлебазаводу з неабходнай вагай і адпускаўся рабочым і працоўным масам па вазе.

Шмат утвараецца чаргі з-за несваячасовай дастаўкі хлеба з хлебазаводу і з-за прыватных размоў прыказчыкаў крам.

Трэба рашуча павесьці барацьбу з нядбайнасьцю і ажыцьцёвіць работу крамных камісій, трэба пралетарскай грамадзкасьці шляхам самакрытыкі вы крываць недахопы ў рабоце каапэрацыі, дапамагаць у яе перабудове адпаведна дырэктывам ЦК, СНК і Цэнтрасаюзу.

А. Ф.

Лепшыя байцы-ударнікі—у партыю Леніна

да 11-й гадавіны вызваленьня Беларусі ад белапанскага ўціску

5-VII—на агульным сходзе №-скага палка да **XI-й** гадавіны вызваленьня БССР ад белапалякаў падалі заяву а прыёме ў партыю наступныя т.т.: Панейка, Стралкоўскі, Дакука, Алісіевіч, Сіткевіч, Папко, Івандзікаў, Гайкін.

В. К.

„Чырвоны Мэталіст" павінен перабудаваць

усю сваю работу для ліквідацыі прарываў на заводзе

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Партыйная і прафэсыянальная арганізацыя заводу «Чырвоны Мэталіст» забіла трывогу вакол прарыву ў выкананьні прамфінпляну. Пастанова бюро парткалектыву і рэзалюцыя агульнага

У паход за бальшавіцкую ўборку тэхнічных культур

„...менавіта з-за недахопаў уборачнай кампаніі мінулага году мы ня поўнасьцю забясьпечылі сябе вынікі добрага ўраджаю і гэта павінна нас навучыць таму як трэба рыхтавацца да ўборачнай кампаніі" (Молатаў)

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"—ШЭФ ГАРАДОЦКАГА ЛЁНАВОДЧАГА РАЁНУ

Бярэм шэфства над Гарадоцкім раёнам

Гарадоцкі лёнагадоўчы раён у веснавой сяўбе гэтага году дабіўся цэлага раду посьпехаў. Раён калектывізаваны на 44,9 проц. Павялічыў плошчу пасеву тэхнічных культур на 200 проц. супроць мінулага году. Плян засеву лёну і канапель выкананы на 101,5 проц.

Усе гэтыя посьпехі высоўваюць перад раённымі арганізацыямі задачу сталай бальшавіцкай падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі.

Газэта «Савецкая Беларусь бярэ шэфства над Гарадоцкім раёнам па аказаньні канкрэтнай дапамогі ў галіне мабілізацыі мас на выкананьне асноўных задач уборачнай кампаніі.

Сярод іншых канкрэтных мерапрыемстваў рэдакцыя высылае ў Гарадоцкі раён выязную рэдакцыю, яная арганізуе старт уборачнай эстафэты саветаў з гэтага раёну.

Гарадоцкі РК КП(б)Б аб шэфстве „Савецкай Беларусі"

(ПА ТЭЛЕГРАФЕ)

Гарадоцкі камітэт партыі шчыра вітае рэдакцыю «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» з узяцьцем шэфства над нашым раёнам. Шэфства паслужыць парукай у далейшай барацьбе з клясавым ворагам за справу калектывізацыі.

Раённы камітэт партыі ўпэўнены, што рэдакцыя дапаможа мабілізаваць савецкую грамадзкасьць па выкананьні задач уборачнай кампаніі, уборкі лёну, падрыхтоўцы да васеньняй пасеўкампаніі і далейшаму руху калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай падставе кулацтва як кляасы.

Сакратар Райкому КП(б)Б КАВАЛЁЎ.

Даць будматар'ял і тэхнічную сілу лёназаводам

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР пра ход будаўніцтва лёназаводаў

Выслухаўшы даклад старшыні Праўленьня Белленаканапляводбуду тав. Палякова, Камісія Выкананьня лічыць устаноўленым, што неаднаразовыя дырэктывы Ўраду БССР (пастановы ЭКАНА за 18 лютага 1931 г. (пр. № 5, п. 5) «Пра будаўніцтва ільняных і канапляных апрацоўчых заводаў у 1931 г. і за 27 лютага 1931 г. (прат. № 6 п. 27) «Пра будаўніцтва лёнапеньковых заводаў у БССР», пастанова СНК за 13-III—31 г. «Пра ход будаўніцтва лёназаводаў» пастановы Камісіі Выкананьня за 20-V—31г. (газ. «Савецкая Беларусь» № 121 за 30-V) «Пра выкананьне дырэктыў аб будаўніцтве лёназаводаў» і ЦК КП(б)Б за 26-V—31 г. аб будаўніцтве лёназаводаў па галоўнейшым пытаньням (разгортваньню будаўніцтва, забясьпечаньне будматарыялямі і г. д.) выконваюцца зусім нездавальняюча. Да гэтага часу няма належнага пералому ў разгортваньні будаўніцтва, будаўніцтва праходзіць такімі марудными тэмпамі, якія не забясьпечваюць сваячасовага сканчэньня яго ў гэтым годзе.

Лічачы такое становішча ў далейшым зусім недапушчальным, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Беларускае Аддзялень не Лёнаканапляводбуду пад адказнасьць т. Палякова і Ярмоніна (загадчык вытворча-тэхнічнага аддзелу) і начальнікаў будаўнічых вучасткаў, неадкладна разгарнуць будаўніцтва лёназаводаў такімі тэмпамі, каб будаўніцтва вытворчых корпусоў і мантажныя работы былі скончаны ў вызначаныя тэрміны.

Прыняць да ведама паведамленьне Белленаканапляводбуду, што ім, на падставе ўстаноўленых Саюзлёнаканапляводбудам канчатковых тэрмінаў пуска лёназаводаў ў эксплёатацыю, устаноўлены наступныя тэрміны заканчэньня вытворчых корпусаў да 1 ліпеня пяці льняных заводаў, 15-га ліпеня—4 льняных, 20-га ліпеня—1 пянькова, 1-га жніўня 11 льняных, 15-га жніўня—19 льняных і 1 пянькова, 1-га верасьня—3 льняных і 1 пянькова заводаў і што тэрміны паступленьня машын і абсталяваньня ўстаноўленых Саюзлёнаканапляводбудам саўпадаюць з паказанымі тэрмінамі заканчэньня вытворчых карпусоў.

2. У сувязі з ўключэньнем будаўніцтва лёназаводаў у ударную групу: а) прапанаваць Дзяржпляну пад адказнасьць загадчыка Будсэктару т. Штыфмана цалкам забясьпечыць снабжэньне гэтага будаўніцтва мясцовымі (пэгела, лесаматарыял) будаўнічымі матарыяламі; б) абавязаць Белдзяржснаб пад адказнасьць тав. Дабравольскага у першую чаргу рэалізаваць маючыяся нарады на будматар'ялы (жалеза, цьвікі, цэмант, толь, вапна) для будаўніцтва лёназаводаў; в) адзначаючы, што значная частка райвыканкомаў ня выканалі пастановы Камісіі Выкананьня за 20 мая г. г. (газ. «Савецкая Беларусь» № 121 за 30 мая 1931 г.) аб падрыхтоўцы і вывазцы мясцовых будматарыялаў—даручыць РВК, пад адказнасьць старшынь, на працягу дэкады забясьпечыць будаўніцтва лёназаводаў мясцовымі матарыяламі (камень, пяском, глінай, гравіем), скончыўшы у гэты ж тэрмін вывазку на месца будаўніцтва мясцовых будаўнічых і лесаматарыялаў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Працы, пад адказнасьць тав. Радзіонава:

а) на працягу трох дзён перадаць Белленаканапляводбуду тых тэхнікаў, якія былі вылучаны Народным Камісарыятам Працы і яго мясцовымі органамі на будаўніцтва лёназаводаў і да гэтага часу фактычна не перададзены;

б) аказаць практычную дапамогу ў забясьпечаньні мантажных работ патрэбнай колькасьцю мэханікаў;

4. Прыняць да ведама заяву прадстаўніка Народнага Камісарыяту Снабжэньня тав. Мірынгофа аб тым, што рабочыя па будаўніцтву лёназаводаў будуць забясьпечаны па другому сьпісу, паводле паказаньняў НКСнабу СССР.

5. Даручыць ВСНГ распрацаваць разам з НК Земляробства і падаць на працягу дэкады на разгляд Эканамічнага Савету БССР пытаньні аб выдзяленьні спэцыяльнага цэху на адным з заводаў Белмэталёаб'яднаньня для аб слугоўваньня мантажу лёназаводу.

6. Даручыць Народнаму Камісару Земляробства тав. Рачыцкаму узяць пад свой беспасрэдны нагляд ход будаўніцтва лёназаводаў, ужываючы ўсе захады да зьнішчэньня перашкод свая часоваму сканчэньню будаўніцтва.

7. Усклаць адказнасьць па будаўніцтву лёназаводаў:

а) На Белленаканапляводбуд за арганізацыю ўсяго будаўніцтва, сваячасовы мантаж і пуск заводаў у эксплёатацыю;

б) на Дзяржплян—за сваячасовае снабжэньне будаўнічымі матар'ялямі;

в) на адпаведныя раённыя выканаўчыя камітэты—за аказаньне практычнай дапамогі ў снабжэньні рабочай сілай, снабжэньня мясцовымі будаўнічымі матарыяламі і вывазку будматарыялаў і лесу.

Старшыня Камісіі выкананьня пры СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН.

29 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

ТЭМПЫ ГАРАДОК НЯ ЗДАСЬЦЬ

„Вітаю рашэньне „Савецкай Беларусі" аб шэфстве над нашым раёнам"

(Гутарка з старшынёй Гарадоцкага РВК тав. Сапрыцкім).

Гарадоцкі раён закончыў веснавую сяўбу з такімі дасягненьнямі: а) калектывізавана 46 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак; б) плошча яравога пасеву павялічана на 21 проц., або на 7.700 га супроць мінулага году; в) павялічана плошча пасеву лёну на 7.100 га або на 200 проц., кораньплодаў—на 236 проц., сеяных траў—на 44 проц. і бульбы на 47 проц. Пашырэньне плошчы пасеву ішло за кошт асваеньня бросавых зямель, скарачэньня паравога кліну і скарачэньня пасеву зярнёвых—менш рэнтабэльных культур.

Значныя гэтыя дасягненьні тым, што Гарадоцкі раён займаў да вясны 1931 г. самае ганебнае месца ў рэспубліцы як па калектывізацыі (на 1-II—31 г. было колектывізавана 6 проц.) так і па іншых паказьніках. Вядома, напрыклад, што Гарадоцкі раён ўвосень 1930 году скараціў і недасеяў 8.000 га азімых культур, праваліў зяблевае ворыва. Недаабкладзена кулацка-заможная частка вёскі і г. д. Апартуністы ўсіх колераў даводзілі, што Гарадоцкі раён зьяўляецца «асаблівым раёнам» і што там, моў, усё ня так, як у іншых раёнах БССР і г. д.

Мы занялі перашае месца ў рэспубліцы па сяўбе лёну—засеяна на 1-VII—10.650 га (у мінулым годзе было засеяна 3.500 га—плян быў выкананы на 55 проц.).

Першапачатковы плян НКЗ у 8.500, а затым павялічаны ў 10.360 га нами перавыкананы. Удзельная вага культуры лёну ў сыстэме яравога кліну займае 25,5 проц. супроць 10 пр. у мінулым годзе. **Гарадок становіцца адным з асноўных лёнаводчых раёнаў БССР.**

Мы апярэдзілі па колькасьці пасеву і па ўдзельнай вазе лёну такія лёнаводчыя раёны, як Дрыса, Лёзна і Сураж. Дасягненьні бязумоўныя, але-ж было-б шкодным і ня сур'ёзным калі-б сказаць, што ўсё зроблена. Перад намі стаіць вялізарная задача ўбраць, апрацаваць і здаць сацыялістычнай прамысловасьці вялікую колькасьць валакна і семя.

Разам з далучанай часткай Межанскага раёну, плошча лёну, падлягаючая ўборцы, вызначаецца каля 14.000 га. Задача вельмі цяжкая і вялікая, але магчымая для выкананьня. Сацыялістычная прамысловасьць павінна будзе атрымаць ад Гарадоцкага раёну 150—200 тыс. пуд. валакна і вялікую колькасьць семя.

Вось чаму рашэньне рэдакцыі «Савецкая Беларусь» узяць шэфства над нашым раёнам па час уборкі лёну зьяўляецца сваячасовым, асабліва калі ўлічыць, што такі буйны раён ня мае сваёй раённай газэты. Выязная брыгада газэты «Савецкая Беларусь» дапаможа нам арганізаваць вучот у калгасах, увесьці зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку ў калгасах, арганізаваць сацыялістычныя мэтады работы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Уборачная кампанія як і веснавая сяўба будуць праходзіць ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы, кулак ужыве свае намаганьні, каб сарваць уборку.

Газэта «Савецкая Беларусь» дапаможа нам весьці барацьбу з кулаком і яго агентурай—правымі апартуністамі, якія баючыся труднасьцяй, уносяць панёку ў нашыя рады.

«Савецкая Беларусь» дапаможа нам разгарнуць масавую работу вакол уборкі, арганізаваць калгасную масу, беднякоў і сераднякоў некалгасьнікаў за новы прыліў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

«Савецкая Беларусь» падцягне адстаючых, прымусіць каго-нікаго з цэнтральных арганізацый павярнуцца тварам да ўборачнай кампаніі.

Я ўпэўнены, што тэмпы ўзятыя Гарадоцкім раёнам у веснавую кампанію, ня спыняцца, з такім-жа напружаньнем і настойлівасьцю будзем працаваць ва ўборачную кампанію. Мы занялі першае месца па пасеве лёну, гэтае першынство будзе рашуча адстойваць і ва ўборачную кампанію.

Тэмпы Гарадок ня здасьць!





УДАРНІКІ ЛЕНАВОДЧЫХ КАЛГАСАЎ—

на перадавыя пазыцыі ўборкі

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону ад нашага спэц. кар.). На Ўсебеларускім зьлёце ўдарнікаў лёнаводчых калгасаў т. Міцькоў зрабіў падрабязны даклад аб выніках другой калгаснай вясны і чарговых задачах уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі.

Пад кіраўніцтвам КП(б)Б, ва ўмовах бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі,—кажа т. Міцькоў,—на аснове разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы—ударніцтва і сацспаборніцтва, увядзеньня зьдзельшчыны мы дабіліся вялізарнейшых посьпехаў у выкананьні плянаў сяўбы. Па збожжавых культурах калгасны сэктар выканаў у паўтары разы больш плян сяўбы, чым аднаасобны сэктар. Па лёне—у два разы, па кораньплодах—у два з паловай разы, канопляне—у тры разы больш за індывідуальны сэктар.

Ад посьпехаў правядзеньня ўборачнай кампаніі будзе залежыць пасьпяховасьць далейшага разгортваньня калектывізацыі. На калгасы ўскладаецца задача—сваёй ударнай работай, добрай пастаноўкай арганізацыі працы, увядзеньнем зьдзельшчыны ў калгасах за бясьпечыць усе неабходнейшыя ўмовы для таго, каб да канца 32 году калектывізацыя сельскае гаспадаркі БССР была ў асноўным закончана.

Побач з посьпехамі ў разгортваньні калектывізацыі маюцца значныя посьпехі і ў справе ўзброеньня калгасаў тэхнікай. Зараз будуецца 46 лёназаводаў і 13 МТС, якія будуць абслугоўваць сацыялістычны сэктар сельскай гаспадаркі. Перад калгасьнікамі лёнаводчых раёнаў стаіць баявая задача—даць нашай прамысловасьці сыравіну. Таму ніводнага кілё лёну і канапель не павінна застацца на полі. Трэба прыняць пад увагу яшчэ і тое, што лёнаўборачнымі машынамі мы зможам калгасы забясьпечыць зусім у недастатковай колькасьці і таму ўборка лёну павінна быць галоўным чынам праведзена ўручную. Трэба выканаць задачу—скончыць уборку лёну да 1-га верасьня і здаць сыравіну нашым фабрыкам не пазьней 1-га студзеня 1932

Пераходзячы да парадку аб аплаце працы ў калгасе тав. Міцькоў сказаў, што трэба яе праводзіць на аснове аплаты за канкрэтна праробленую работу з улікам яе колькасьці і якасьці.

У заключным слове тав. Міцькоў сказаў, што ад таго наколькі будзе пасьпяхова праведзена ўборка ўражаю, будзе залежыць пасьпяховае выкананьне плянаў нашае прамысловасьці.

Засталіся лічаныя дні

Будаўніцтва Халопеніцкага лёнаапрацоўчага заводу павінна быць закончана да 1-га ліпеня г. г.

Аднак будаўніцтва заводу ідзе марудна. Яшчэ не закончана вывазка лесаматар'ялу. Піламатар'ялу таксама няма. Рабочых не хапае. У той час як патрэбна 20 рабочых, іх працуе чалавек 13. Каменьня таксама не хапае і яго зусім слаба возяць. Няма і цьвікоў.

Такое становішча тлумачыцца тым, што Халопеніцкі РВК зусім апартуністычна адносіўся да будаўніцтва заводу.

Начальнік Чашніцкай будаўнічай групы Муроўскі, які адказвае за пабудову Халопеніцкага заводу бязьдзейнічае. Будаўніцтва заводу пад пагрозай зрыву.

— Усё роўна ня скончым да 1-га ліпеня—так разважаюць цяпер апартуністы, а таму ня прымаюць ніякіх мер каб зараз-жа па бальшавіцку скончыць будаўніцтва.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута паміж рабочымі.

Грэбля, якую парвала заводка яшчэ не адрамантавана. А таму і перашкаджае загатаўляць розныя матар'ялы для заводу, бо няма як праехаць.

Кулакі павялі контрэвалюцыйную агітацыю супроць будаўніцтва заводу.

Па раёне ад кулакоў ходзяць чуткі: — Навошта завод будаваць, хутка вайна будзе. Будуць абкладаць індывідуальным тых сялян, якія працуюць каля заводу...

Так гавораць кулакі.—Няхай калгасы будуюць, а для аднаасобнікаў ён не патрэбен.

У выніку гэтай агітацыі ёсьць выпадкі калі сяляне кідаюць працу.

Гэтай агітацыі не даецца адпору. Культмасавай працы сярод рабочых няма. Райкомы партыі, і камсамолу ня цікавяцца будаўніцтвам.

Засталіся лічаныя дні. Трэба каб пракуратура прыняла належныя меры і забясьпечыла пабудову ў тэрмін.

Аляксяёнак Янка.

Зрыўшчыкаў месячніку да адказнасьці

Месячнік лесазагатовак і лесавывазкі па Сьмілавіцкаму раёну на мяжы поўнага правалу.

Заданьне па загатоўцы строю 2.900 к. м. і дроў 6.360 раўмэтраў ня выкананa ні адно бервяно, ні на адно полена. Вывазка будоўных матар'ялаў мае кантрольную лічбу 10.190 к. м. і дроў 1.500 р. м. На 30-е чэрвеня з гэтай колькасьці вывезена толькі 1.808 к. м. строю ці 17,7 проц. заданьня.

Дроў-жа вывезена столькі, сколькі загатоўлена—нуль.

На лесавывазку Сьмілаўскі РВК зьвяртае ўвагу ў апошнюю чаргу. Да гэтага часу РВК ня можа перабудавацца на ўласны вучот лесавывазкі па ўведзеным у Менскім Леспрамгасе марачнай сыстэме. Фактычна атрымоўваецца, што вучот і ўсе сьпісы замацаванага насельніцтва вядзе не сябра сельсавету, а дзесятнік ці лясьнік вучлесгаса.

За вучлесгасамі (Сьмілавіцкім і Трасьцянецкім) замест 240 лесарубаў не замацавана ні воднага, а на вывазку РВК вылучыў 600 гужадзінак, забясьпечыўшы такім чынам лесавывазку менш чым на палову. Але і гэтую разь вёрстаную лічбу сельсаветы не выканалі.

Дукорскі сельсавет вылучыў 100 коняй, але на другі-ж дзень адмацаваў в. Маладнева з 20 конямі для саўгасу.

Вальвачоўскі сельсавет замест 100 коняў вылучыў толькі 52, але і гэтых ледзь ня ўсіх адмацаваў да Убельскай грэблі.

Рудзенскі сельсавет вылучыў 80 коняў (80 проц. заданьня), але і гэтых пераключыў на вывазку каменьня.

У Карзуноўскім сельсавеце, прымацаваная в. Дукоршчына была таксама пераключана ў самым пачатку месячніка на пабудову сьмілаўскай грэблі.

Нарэшце Драчкоўскі сельсавет, які з 100 коняў згодна заданьня «знайшоў» толькі 80 і тых цалкам прымацаваў да перавозкі ўгнаеньня і іншых работ у саўгасе «Вызваленьне».

Адносіны арганізацый Сьмілаўшчыны да месячніка характарызуе такі факт: тэхніка вучлесгаса т. Лукашэвіча, у якога шмат працы, асабліва ў часе месячніка, і па сплаву і па вывазцы і па падсочным промыслу—кіраўнікі раёну здымаюць з працы і накіроўваюць на правядзеньне розных іншых кампаній. Дзе-ж тут спадзявацца, што РВК дапаможа месячніку, калі зьнімае з яго тэхпэрсанал?

Райкалгассаюз з вяліжай неахвотай падпісаў заданьне паўтара дзесяткам калгасам на вывазку 750 к. м. строю з разьліку 2 к. м. на каня.

І тым ня менш у раёне ёсьць і зараз магчымасьці выканаць плян месячніку. Трэба толькі ўнесьці яскравасьць на ўзаемаадносіны РВК з сельсаветамі («першы загадвае, а другія ня выконваюць»), мабілізаваць грамадзкасьць раёну, калгасы, камсамол, сельсаветы, райпрафсавет, настаўніцтва на пасьпяховае заканчэньне месячніка, аслабаніць тэхпэрсанал у час ударнай працы, калі патрэбен іх пільны нагляд, ад правядзеньня не зьвязаных з месячнікам кампаній.

З маючайся ў раёне гужсілай можна закончыць месячнік у 4 дні і старшыня РВК т. Шэляг—павінен забясьпечыць выкананьне пляну месячніка ў гэты тэрмін.

Трэба раўняцца па сялянах в. Дукора, Дукорскага сельсавету, якія за дэкаду ад пачатку месячніка на 24-VI выканалі заданьне больш як на трэць.

Т. т. Сянчук Марцін (69 проц.), Шахоцька Якуб (38 проц.), Глінцэвіч Ігнат (39 проц.), Цярэшка Макар (36 проц.), Лабус Міхась (45 проц.), Кароткі Ігнат (37 проц.), Лабус Мірон (41 проц.) і інш.

Гэтыя таварышы забясьпечваюць выкананьне кантр. лічб месячніка як бы не імкнуліся яго сарваць некаторыя «сельсаветчыкі».

Па ўсіх павінен раўняцца і ўвесь Сьмілаўскі раён.

Алесь Новікаў.

РАСТЛУМАЧЭНЬНЕ ЗАКОНУ АБ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМ ПАДАТКУ НА 1931 г. выклікала значны калгасны прыліў у в. Мышанскі, Бесядзкага сельсавету, Капаткевіцкага раёну.

Старыя і новыя калгасьнікі аб'вясьцілі сябе ўдарнікамі ўборачнай кампаніі.

Лясун.

БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ ЛЁНАКАНАПЛЯВОДНЫХ РАЁНАЎ

У мінулым годзе ўборка, апрацоўка і загатоўка с-г сыравіны была найбольш слабым вучасткам. Непадрыхтаванасьць да ўборкі і апрацоўкі прывяла да вялікіх страт. У пасобных раёнах гэтыя страты складалі больш паловы валавога ўраджаю. Карыстаючыся прарывам на фронце уборкі, кулацтва і падкулачнікі вялі агітацыю пад лёзунгам: «ня сейце тэхнічныя культуры—згніе, сейце тое, да чаго прывыкні—збожжа». Такімі настроямі ахоплена і частка калгасьнікаў, нават камуністаў і камсамольцаў.

Аднак-жа на падставе саўгасаў, калгасаў, МТС і шырока разгорнутай барацьбы за тэхнічныя культуры, у першую чаргу лён і канопля, рабочая клясса і бядняцка-серадняцкія масы сялянства пад кіраўніцтвам КП(б)Б зламалі супраціўленьне клясавага ворага дабіліся яшчэ большага пашырэньня пасеўных плошчы пад тэхнічнымі і збожжавымі культурамі. У параўнаньні з мінулым годам на сёньняшні дзень плошча засеву па лёне павялічылася на 60 проц., па каноплях амаль-што 50 проц., а калі ўзяць у раённым разрэзе, дык ёсьць раёны, якія павялічылі плошчу засеву гэтых культур на 200 і больш процантаў.

Гарадоцкі раён даведзеў плошчу засеву пад лёнам да 11 тыс. га. Але выкананьнем пляну па тэхнічных культурах барацьба за с-г сыравіну не канчаецца, а толькі пачынаецца. Пасеяць значна лягчэй, чым убраць, дагледзець, апрацаваць і здаць дзяржаве. Вакол гэтых работ клясавая барацьба прыме больш вострых характар.

Вось чаму патрэбна ўжо зараз біць трывогу і змагацца з тымі асобнымі кіраўнікамі саўгасаў, калгасаў, МТС і ячэк, якія недаацэньваюць надыходзячых работ і труднасьцяй, зьвязаных з імі, з тымі, якія заражаюцца летнімі адпускнымі настроямі і ходзяць паклаўшы рукі ў кішэні не мабілізуюць мас на падрыхтоўку да ўборкі, апрацоўкі і лёназагатовак.

Значэньне работ і складанасьць прымушае друк з дня ў дзень высьвятляць і правяраць ход падрыхтоўкі да ўборачна-апрацоўчай кампаніі, арганізоўваць масы і біць па тых, хто нявольніцкімі тэмпамі рыхтуецца да гэтай вялізарнай палітычна-гаспадарчай кампаніі, ад посьпехаў якой будзе залежыць далейшы рост калгаснага руху ў БССР, забясьпечанасьць тэкстыльных фабрык і выкананьне прамфінпляну З рашаючага году пяцігодкі.

Супраціўленьне кулакоў і падкулачнікаў і недастатковая барацьба з імі, самацёк у рабоце, ураўнілаўка ў разьмеркаваньні даходаў у калгасах, слабая праверка складаньня і выкананьня плянаў уборкі, апрацоўкі і загатовак, няўменьне і нежаданьне арганізаваць масы вакол выкананьня іх і рабочую сілу для працы,—галоўныя ворагі мінулага году і надыходзячых кампаній, якія павінны быць сваячасова зьнішчаны.

Лён самая працаёмная культура ў с-г на сёньняшні дзень. Работа па сяўбе лёну і канапель толькі ⅛ частка ўсёй работы, а ⅞ пасля ўборку і першапачатковую апрацоўку. У аднаасобным сялянскай гаспадарцы на ўсе работы ад ворыва да ачэ к галовак траціцца 18,6 дзеяньдзінак дзен, а на першапачатковую апрацоўку—45 дзен. Калі лён не прапаць, дык ён можа зусім прапасьці, у найлепшым выпадку будуць страты на мейш 30 проц.

Страты ад пустазельля па СССР у 1922 годзе складалі 20—22 проц.

Паводле заяў знатакоў ільнянай справы, дзякуючы дапатопным спосабам першапачатковай апрацоўкі лёну мы трацім да паловы валакна кожны год. На гэтым як ні трэба ляпей сьцьвярджаецца адна з многіх мудрых кітайскіх прыказак, што «зямля ўродзіць і дасьць столькі, наколькі чалавек, яе апрацоўваючы, здолее прымусіць яе ўрадзіць».

А таму **трэба сваячасова правесьці праполку**, ня даць перастаяць, пераляжаць, прасачыць за якаснай лепшай апрацоўкай, што значна павялічыць базу сыравіны для лёгкай прамысловасьці, якая хутка расьце на базе ніжкай прамысловасьці СССР.

Культура лёну і канапель патрабуе адпаведнага сабе і севазвароту і камбінаваньня з іншымі культурамі, інгнараваньне яго можа прывесьці да зьнікненьня ўраджаю з году ў год. Раённыя ўстановы, на дапамогу якім павінны прыйсьці і навуковыя ўстановы, павінны вызначыць справу колькі якіх культур і галін с-г трэба камбінаваць у лёнаводчых раёнах улічваючы біялёгічныя, экзамацічныя ўмовы і ўмовы глебы і пачаць праводзіць ў жыцьцё. Бо вядома, што часты зварот засеву на старыя месцы паніжае ўраджай нават на сучасных зуціненьнях. А чаргаваньне лёну з канюшынай пакуль-што зьяўляецца галоўным сродкам падвышэньня ўраджаю лёну. Вырашэньне справы севазвароту ў лёнаводчых раёнах значна паглыбіць справу спэцыялізацыі раёну і пашырыць кармовую базу для жывёлагадоўлі ў іх.

Пры падрыхтоўцы да ўборкі тэхнічных культур, у плянах уборкі і разьмеркаваньня рабсілы трэба ўлічыць яшчэ адзін момант. Самая гарачая ільняная пара цягнецца ад жніўня месяца да студзеня, супадае з работай па ўборцы бульбы, па ўборцы і малаць збожжавых культур, якія таксама павінны быць убраны на 100 проц.

Разрадзіць сустрэчу многіх работ можна галоўным чынам мэханізацыяй і хімізацыяй апрацоўкі лёну. Аднак-жа «пры значным росьце таварнай прадукцыі па ўсіх тэхнічных культурах і толькі пачаўшайся мэханізацыяй іх уборкі і першапачатковай апрацоўкі—асноўная частка работы будзе ў гэтым годзе праводзіцца ўручную і конным інвэнтаром» (з пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б).

На гэта зьвярнуў увагу і толькі-што адбыўшыйся пленум ЦК КП(б)Б.

Але ня гледзячы на цяжкія абставіны з ўборкай, ёсьць усе ўмовы для таго, каб правесьці ўборку, апрацоўку і загатоўку цалкам у кожным раёне, калі па-бальшавіцку возьмуцца за падрыхтоўку, калі будуць праведзены наступныя мерапрыемствы:

Правільная расстаноўка сіл па ўсіх вучастках уборкі і апрацоўкі. Партыйцы, камсамольцы, члены прафсаюзаў, якія працуюць на вёсцы, павінны арганізаваць работу калгасьнікаў і паказаць прыклад асабістым удзелам і змагацца за скарачэньне тэрмінаў уборкі, апрацоўкі і загатовак. Усе сілы павінны быць разьмеркаваны паміж усімі брыгадамі і працаваць у полі, на заводзе, а не абіваць парогі ў канцыляры калгасу.

Максымальнае скарыстаньне ўборачных машын і тых заводаў на першапачатковай апрацоўцы лёну і канапель, якія будуюцца і павінны быць сваячасова пабудаваны ў БССР — другая ўмова, якая будзе рашаць посьпехі ўборкі і апрацоўкі. Ніводная хвілінка прастою машын, ніводнага дня зацяжкі з пабудовай заводаў—вось лёзунг дня.

Шырокае разгортваньне масавай работы вакол выкананьня пляну, масавай работы ў полі—трэцяя ўмова.

Работа вытворчых нарад і па выкананьні рацыяналізатарскіх прапоноў павінна быць шырока разгорнута і паглыблена. Арганізацыя ясель, дагляд дзяцей у часе ўборкі, сваячасовы і належны завоз прамтавараў, арганізацыя харчаваньня ў полі павінны быць скарыстаны для паталоўнага прыцягненьня жанчын да ўборкі, апрацоўкі і загатовак лёну і канапель. **Трэба памятаць і ўлічыць, што жанчыны ў ільнянай справе зьяўляюцца галоўнымі арганізатарамі і распарадчыкамі лёнаводкіна і пянькі.**

Непасрэдна на вытворчай працы ў брыгадзе павінны быць усе партыйцы і камсамольцы і там разгортваць масавую культурна-палітычна-асьветную работу праз гурткі, чытаньне газэт, выданьне палявых насьценных газэт, вытворчыя нарады ў полі і г. д.

Нарэшце, чацьвертая па парадку ная важнейшая па значэньні ўмова, якая вырашае справу—гэта барацьба за перавод усіх работ на зьдзельшчыну, за належную пастаноўку вучоту працы і за курс на індывідуальнае сацспаборніцтва. Тут патрэбна ня толькі агітацыя, але галоўным чынам арганізацыя зьдзельшчыны, устанаўленьне патрэбных норм выпрацоўкі і ліквідацыя абязьлічкі працы, калі брыгада дзеліць працоўныя дні пароўну паміж усімі, ня ўлічваючы колькасьці і якасьці кожнага паасобку. Трэба павялічыць каштоўнасьць працадня і не раскідацца імі направа і налева.

Сацспаборніцтва трэба пашырыць. Побач з сацспаборніцтвам паміж калгасамі, вучасткамі і брыгадамі арганізаваць унутры іх і індывідуальнае сацспаборніцтва. У гэтым зараз галоўнае. Прэміяваньне пашырыць і трэба праводзіць у часе працы, а не пасьля таго як скончаны работы.

Працадні за веснавыя работы павінны быць падлічаны і запісаны ў кніжку кожнага калгасьніка, устанавіўшы сыстэматычны нагляд за іх далейшым належным запаўненьнем. Для гэтай справы павінны быць падрыхтаваны і пасланы галоўным чынам камсамольцы.

Вось тыя пытаньні, якія зьвязаны з уборкай і апрацоўкай. Зразумелая рэч, пасьпяхова правесьці ўборачную кампанію—азначае склаці ўмовы для пасьпяховага правядзеньня загатовак. Мы ня можам адрываць уборачную кампанію ад загатовак і зяблевага ворыва пад лён і канопле 1932 году. У загатоўках галоўнае ў тым, **каб сваячасова давесьці плян да калгасу, вёскі, выявіць і даць цьвёрдыя заданьні кулацкім гаспадаркам,** каб ніводная кулацкая гаспадарка ня ўхілілася ад нашых заданьняў, вылучыць у кожным калгасе, вёсцы адказнага за выкананьне пляну загатовак. Патрэбна растлумачыць, што перш за ўсё трэба здаць дзяржаве, а потым разьмяркоўваць паміж сабой даходы.

Зяблевае ворыва пад лён наступнага году павінна забясьпечыць пашырэньне плошчы пад лён і канопле у 1932 г. паглыбленьне справы спэцыялізацыі, а таксама падвышэньне ўраджаю, бо зяблевае ворыва 1 раз дае больш чым 3 ворывы вясной перад сяўбой. Трэба вызначыць і падрыхтаваць новыя масывы пад культуру лёну і канапель.

Ва ўсёй гэтай рабоце ні ў якім разе нельга абыйсьці, забываць і недаацэньваць значэньня аднаасобнага сэктару, які налічвае яшчэ амаль 60 проц. усіх гаспадарак. Праз добрасусэдзкія адносіны, праз дапамогу аднаасобніку і прыкладную працу калгасу, увязваючы ўборку, апрацоўкі і загатоўкі з задачай уцягненьня аднаасобніка ў калгас, змагацца за далейшае падвышэньне тэмпаў калектывізацыі «каб да веснавой сяўбы 1932 году было-б калектывізавана ня менш 75 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР» (з пастановы ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Рашуча разгортваючы барацьбу з апартуністычнай недаацэнкай важнасьці уборачнай і загатоўчай кампаній, зьвяшчаючы да канца клясавага ворага, які імкнецца сарваць уборку, загатоўку і сацыялістычную перабудову сельскае гаспадаркі, партыйныя арганізацыі лёна-канапляводных раёнаў павінны падвысіць арганізуючую ролю калгасных партыйных і камсамольскіх ячэек і кожнага камуніста і камсамольца паасобку, прымусіць іх глыбока ўнікнуць у пытаньні ўнутры-калгаснага будаўніцтва і спэцыялізацыі раёну.

А дабіцца гэтага можна толькі праз перабудову партыйнай і камсамольскай работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Галодка.

Заходняя Беларусь у полымі забастовачнай барацьбы

Рабочыя Беластоку, Гарадні, Вільні і пабудовы чыгункі Друя—Варапаева бастуюць

Расправа польскіх фашыстаў над працоўнымі Заходняй Беларусі

ВІЛЬНЯ. Польскі друк паведамляе, што ў Пінску закончыўся вялікі працэс падзэроных у камуністычнай дзейнасьці. На лаве падсудных 11 чалавек рабочых і сялян. Згодна паведамленьню тых-жа газэт падсудныя трымалі сябе на баявому. Кожны з падсудных гаварыў аб дзіких катаваньнях, зьдзеках у засьценках ахранкі, а таксама ў фашыстскіх астрогах. Аднак, ня гледзячы на тэрор,—заявілі палітзьняволеныя,—нашы рады, рады барацьбітоў за вызваленьне з пад ярма капіталістычнай няволі растуць і мацнеюць. Замест аднаго арыштаванага прыходзяць новыя дзесяткі, сотні барацьбітоў.

Рабочыя гораду Пінску наладзілі вялізарнейшую дэманстрацыю і як піша «Дзеньнік Віленскі» ад 8 ліпеня 1931 г. «будынак суда фармальна быў асаджаны з усіх бакоў чэрньню». Вялікія атрады паліцыі і «стрэльцаў» з шінтоўкамі напагатове павялі фармальную атаку супроць дэманстрантаў, аднак, апошнія абаранялися каменьнямі, цаглінамі і толькі позна ўвечары ўдалося разагнаць рабочых, «вастанавіць парадак».

Усеагульная забастоўка камунальных рабочых Горадні

ВІЛЬНЯ. Польскі друк паведамляе, што ў Горадні пачалася забастоўка ўсіх рабочых і служачых камунальных прадпрыемстваў. Забаставалі ўсе рабочыя і служачыя электрычнай станцыі і вадаправоду, да іх далучыліся дворнікі, дарожна-транспартныя рабочыя. У знак салідарнасьці да забастоўкі далучыліся рабочыя дзяржаўнай тытунёвай фабрыкі, а таксама ўсе друкары.

Забастовачны камітэт склікаў мітынг бастуючых, на які прыбылі рабочыя ўсіх прадпрыемстваў Горадні. На мітынгу рабочыя аднадушна заявілі, што ў выпадку калі патрабаваньня камунальных рабочых і служачых ня будуць задаволены, яны абвесьцяць забастоўку салідарнасьці.

Горад Горадня прыняў выгляд вайскова-паліцэйскага лягеру. Па вуліцах разьяжджаюць вялікія атрады коннай паліцыі. На кожным рагу вуліцы стаяць паліцэйскі патруль з дзясятка, а то і больш чалавек. Электрычная станцыя і вадаправод заняты вайсковымі сапёрнымі часьцямі, улада і вайсковыя камандзіры прыкладаюць усе сілы, каб пусьціць у рух электрастанцыю і вадаправод. Да будынку электрастанцыі не падпускаюцца рабочыя і служачыя. У горадзе надзвычайна напружанае становішча. Забастоўка набыла выразна палітычны характар. Непасрэднай прычынай забастоўкі было звальненьне двух камунальных рабочых.

Масавыя дэманстрацыі супроць зьдзекаў і катаваньняў палітзьняволеных у Вільні

ВІЛЬНЯ, 10-7. У апошнія дні фашыцкі друк стракаціць паведамленьнямі аб масавых дэманстрацыях, як'я адбываюцца штодня ў Вільні. «Дзеньнік Віленскі» паведамляе, што 9 ліпеня адбылася масавая дэманстрацыя рабочых з сем'ямі палітзьняволеных супроць ужываньня ў Лукіскай турме штучнага кармленьня і нячуваных катаваньняў палітзьняволеных.

Дэманстранты, якія прайшлі некалькі вуліц з чырвонымі сьцягамі адбіваліся ад кардонаў паліцыі каменьнямі, раскідалі шмат лістовак, заклікаючых да арганізацыі масавага пратэсту супроць катаваньняў і зьдзекаў у засьценках дэфэнзывы і астрогах, супроць фашысцкай дыктатуры, крывавага тэрору.

Каля самага астрогу Лукішкі дэманстрантаў спаткаў моцны кардон коннай паліцыі, якая ўрэзалася ў бязбрэйны натоўп. Каля гадзіны цягнулася крывавая бойка дэманстрантаў з паліцыяй пасьля чаго дэманстрацыя была расьсеяна. Некалькі дэманстрантаў паранена і шмат арыштавана.

У той-жа дзень на Шкаплернай вуліцы на ліхтарох быў вывешаны чырвоны плякат з надпісам: «Прэч фашысцкі ўрад тэрору, голаду, беспрацоўя і вайны».

Галодныя беспрацоўныя бяруць хлеб сілай

ВІЛЬНЯ. Пазаўчора натоўп беспрацоўных паўразьдзетых, галодных напаў на пякарню пры вуліцы Субач. Пакуль падасьпелі вялікія атрады пешай і коннай паліцыі беспрацоўныя падзялілі ўвесь маючыйся выпечаны хлеб.

Віленскі буржуазны друк, падаючы гэтае паведамленьне, адзначае, што «галодныя беспрацоўныя не бралі ні булак, ні пірожных, а толькі чорны хлеб, што сьведчыць аб дысцыплінаванасьці беспрацоўных».

Прыбыўшы вялікі атрад паліцыі разагнаў натоўп галодных беспрацоўных прычым сьпісаны пратаколы з кожнага ўдзельніка галоднай дэманстрацыі.

Чарговыя масавыя арышты ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 10-7. На працягу апошніх трох дзён пасупьна адбываюцца масавыя аблавы ад'ўсіх рабочых кварталах Вільні. Паліцыя ўчыніла шматлікія арышты сярод западзэроных у камуністычнай дзейнасьці. Колькасьць арыштаваных асоб натолькі вялікая, што стварае ўражаньне паліцэйскага пагрому ў рабочых кварталах Вільні.

Разам з тым, ахранка пускае правакацыйныя чуткі аб нейкай змове з тым, каб арыштаваных абвінавачіць. У засьценках ахранкі спяцы па фабрыкавальні працэсаў падвяргаюць арыштаваных сярэднявяковай інквізіцыі.

У рабочых колах чарговы пагром, учынены польскай ахранкай, выклікаў ня страх, а яшчэ больш рэвалюцыйны ўздым, яшчэ большую гатоўнасьць да барацьбы з дыктатурай голаду, з дыктатурай беспрацоўя, з дыктатурай вайны.

Ахранка працягвае Падброцкую правакацыю

ВІЛЬНЯ, 10-7. Увесь польскі буржуазны друк пад сэнсацыйнымі загалоўкамі зьмяшчае інспіраваную заметку аб «выкрыцьці» ў рэчцы Зейменцы ля Падбродзя некалькі бомбаў. Хоць гэта правакацыя польскай ахранкі зусім відавочная, аднак заправілы, майстры «выяруговых» спраў імкнуцца «увязаць» гэта з камуністычнай дзейнасьцю.

Сэнс гэтай правакацыі як і кіданьне бомб у Падбродзі заключаецца ў тым, каб абвінавачыць камуністычную партыю Зах. Беларусі ў тэрарэстычных дзеяньнях і судзіць западзэраных у камуністычнай дзейнасьці палявымі ваеннымі судамі.

Пралетарыят ня помсьціцца

Пастанова прэзыдыуму ЦВК СССР

МАСКВА. Прэзыдыум ЦВК СССР пастанаўляе:

1. Канстатуючы выключнае павялічэньне тэмпаў і скарачэньне тэрмінаў будаўніцтва самалётаў для грамадзянскай авіяцыі і адзначаючы выключныя дасягненьні ў сэнсе выпуску новых тыпаў самалётаў, якія стаяць на ўзроўні лепшых заграніччных узораў—узнагародзіць завод № 39, які ўжо мае ордэн «працоўнага чырвонага сьцягу», «ордэнам Леніна» за выкананьне і перавыкананьне плянаў будаўніцтва па вопытаму самалётабудаўніцтву.

2 Амніставаць ніжэйпаданых канструктароў—былых шкодзікаў, прыгавораных калегіяй АДПУ да розных мер сацыяльнай абароны, з адначасовай іх узнагародай:

а) Грыгаровіча, Дзьмітрыя Паўлавіча—галоўнага канструктара па вопытным самалёта-будаўніцтве, які пакаяўся ў сваіх ранейшых злачынствах і сваёй гадовай працай паказаў на справе сваё раскаяньне граматай ЦВК СССР грашовай узнагародай у 10.000 руб.;

б) Шабашкевіча, Аляксандра Васілевіча—галоўнага канструктара—граматай ЦВК СССР і грашовай узнагародай у 10.000 руб.;

в) Былога тэхнічнага дырэктара заводу № 1—Масквіна Івана Міхайлавіча, грашовай узнагародай у 3.000 р.;

г) Крэйнсона, Паўла Максімавіча—грашовай узнагародай у 5.000 руб.;

д) Вэрбэр, Віктара Львовіча—грашовай узнагародай у 1.000 руб.;

е) Амніставаць усіх інжынэраў і тэхнікаў, прыгавораных АДПУ да розных мер сацыяльнай абароны за шкодніцтва, якія зараз добрасумленна працуюць у Цэнтральным Канструктарскім Бюро.

3. Узнагародзіць ордэнам «Чырвонага Сьцягу» начальніка грамадзянскага канструктарскага бюро Т. Калятава за стварэньне цэнтральнага канструктарскага бюро і ўмелую арганізацыю работы і скарыстаньне інжынэраў, былых шкодзікаў на практычнай рабоце.

4. Узнагародзіць ордэнамі «працоўнага Чырвонага Сьцягу» за ўзорную работу ў справе ўзмацненьня тэмпаў і стварэньня новых узораў самалёту наступных работнікаў заводу № 39: Рафаэлянца, Абрама Назаравіча—маладога інжынэра-канструктара, які зьяўляецца бліжэйшым памочнікам галоўнага канструктара Грыгаровіча; Башына, Фёдара Фёдаравіча—рабочага групавода на пабудове; Шэстэра, Леона Барысавіча—рабочага тэхніка, лепшага ўдарніка заводу; Юльева, Цімафея Парфенавіча—рабочага-сьлёсара, лепшага ўдарніка заводу; Ігнацьцева, Дзьмітрыя Іванавіча—рабочага-сьлесара, лепшага ўдарніка заводу; Раманцава, Івана Сяргеевіча—намесьніка за водзкай вытворчасьцю—выдатніка з рабочых; Бухольца, лётніка, за стварэньне новых узораў самалётаў.

Кіно „Культура“ перадаць Яўрэйскаму дзяржаўнаму тэатру БССР

Даць сталую базу яўрэйскаму дзяржаўнаму тэатру

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР на справе паказаў, што здолеў стаць актыўным правадніком генэральнай лініі партыі, сапраўды здолеў зрабіцца тэатрам «нацыянальным па форме і пралетарскім па зьмесьце».

Мы мелі ўжо магчымасьць адзначыць вялікую работу праробленую дзяржаўным яўрэйскім тэатрам БССР за апошнія некалькі год. Пастаноўкі «Стрэл», «На 64-м вучастку», «Паэма аб сякеры»—усё гэта рэпэртуар, які адбівае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР, мабілізуе рабочых і калгасьнікаў на яе пасьпяховае правядзеньне.

Аднак, становішча ў якім знаходзіцца тэатр у сучасны момант гаворыць аб тым, што ён пакуль-што ня мае магчымасьці шпарка расьці з-за ўмоў, у якія ён у апошнія часы пастаўлены. Асноўную прычыну ў некаторым затрыманьні росту тэатру трэба шукаць таксама і ў адсутнасьці сталай базы—памяшканьня для дзяржаўнага яўрэйскага тэатру БССР.

Як выконваецца вытворчы плян на мечаны тэатрам?

Тэатр заказаў на бліжэйшы адрэзак часу 37 п'ес, якія павінны адбіваць сацыялістычнае будаўніцтва. Заключаны дагаворы з пісьменьнікамі, але выкананьне імі дагавораў ідзе самацёкам. Калі 2 гады таму назад на працягу сэзону тэатр выканаў чатыры пастаноўкі (калі тэатр знаходзіўся ў Менску), дык зараз, калі тэатр увесь час вандруе, калі сталай базы ў яго няма, вытворчы плян у гэтым годзе ня выкананы.

У мінулым годзе ў сярэднім пастаноўка працягвалася 2½ месяцы. У гэтым годзе, пастаноўкі, як напрыклад, «Паэма аб сякеры» працягвалася 5 месяцаў.

Досыць сказаць, што за апошнія 5 месяцаў тэатр зрабіў 4 пераезды ў розныя гарады БССР і УССР.

Наглядаецца таксама цякучасьць у складзе актораў тэатру. З 33 чалавек складзе актораў тэатру. З 33 чалавек засталося 24. Такой цякучасьці ў гэтым тэатры ніколі ня было і толькі таму, што ён зараз пастаўлены ў немагчымыя ўмовы, гэтая цякучасьць працягваецца.

Нельга таксама гаварыць аб якой-небудзь сталай падрыхтоўцы тэатральных кадраў. Школа акторскіх кадраў, якая адкрыта пры тэатры, ня мае ніякіх перадумоў. Тэатр на сваю рызыку адкрыў гэтую школу. Сталага настаўніцкага складу няма і курсы гэтыя цягнуць мізэрнае існаваньне.

Фінансавае становішча тэатру. Тут справа катастрафічная. Калі ў мінулым годзе тэатр даў прыбытак у 3.000 рублёў, дык зараз тэатр мае дэфіцыт у 25.000 руб.

Усё гэта ўпіраецца ў адно пытаньне, у пытаньне адсутнасьці сталай базы. Тэатр ня мае памяшканьня. Некалькі разоў на працягу апошняга году гэтага пытаньне стаяла ў адпаведных арганізацыях вельмі востра. Кожны раз выносілі пастановы, якія прызнавалі неабходнасьць стварэньня тэатру ў Менску. Аб гэтым гаварылі: ЦК саюзу, Наркамасьветы і інш. арганізацыі, але канкрэтна гэтым пытаньнем ніхто як сьлед не займаўся.

Нарэшце, узьнялося пытаньне аб перадачы яўрэйскаму дзяржаўнаму тэатру «Дому Культуры» ў Менску. Пытаньне было амаль-што вырашана. Тэатру нават прапанавалі выбраць памяшканьне паміж гартэатрам і «Домам Культуры». На гэтай падставе тэатр зараз прыехаў у Менск. Але ня тут то было. Пытаньне з базай зноў адцягваецца, зноў няма выразнасьці дзе ён будзе працаваць.

З усіх тых фактаў, якія мы сёньня падавалі яскрава відаць, што пры такім становішчы тэатр ня мае ніякіх умоў для далейшага і пасьпяховага росту. Пытаньне выкананьня вытворчай праграмы, пытаньне кадраў, якасьці прадукцыі, гаспадарчага разьліку—усе яны ўвязаны і ўпіраюцца ў адно пытаньне—ў пытаньне сталай базы для тэатру.

Дзяржаўны яўрэйскі тэатр БССР гэтую базу павінен атрымаць. Тэатр давёў, што здолеў стаць вострай зброяй партыі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва і ні ў якім разе нельга дазволіць каб тэатр іншоў уніз.

Гаворачы аб сталай базе для тэатру, аб частых пераездах мы ня маем на ўвазе, тое, што тэатр не павінен гастраляваць, выяжджаць у вытворчыя цэнтры, у калгасы. Гэта было-б вялікай памылкай. Але тэатр ня вінен мець сталае мейсца, дзе канцэнтраваць усю сваю вытворчую, мастацкую і палітычную работу.

Мы ставім перад адпаведнымі арганізацыямі пытаньне аб тым, каб зараз-жа вырашыць лёс яўрэйскага дзяржаўнага тэатру БССР. Трэба стварыць усе магчымасьці, якія-б спрыялі яго далейшаму росту.

Брыгада «Сав. Бел.»: Мойн, Цыпкіна, Рудштэйн і Брадоцкі.

Палепшыць бытавыя ўмовы акторaў

Адсутнасьць сталае базы для Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатру БССР ставіць яго ў такія ўмовы, пры якіх яго далейшае разьвіцьцё, далейшая пасьпяховая работа затрымліваецца. Мы асабліва падкрэсьліваем апошняе таму, што тэатр у выніку—адсутнасьці гэтае базы стаіць перад сэр'ёзнай пагрозай затрыманьня свайго росту.

Пераважная большасьць артыстаў ня мае кватэр нават і тады, калі тэатр знаходзіцца на гастролях у Менску.

Ня лепш стаіць справа і з забесьпячэньнем артыстаў па лініі каапэрацыі, (гэта таксама ў значнай ступені зьвязана з адсутнасьцю базы). Тут атрымліваецца такое становішча. Быць на сталым каапэрацыйным забесьпячэньні ў Менску артыстым і іх сем'ям нельга таму, што палову прыблізна, году яны вандруюць. Атрымліваць усе віды забесьпячэньне па другіх гарадох ім таксама нельга таму, што ў іх яны незатрымліваюцца на доўгі час і таму ня маюць магчымасьці быць прымацаванымі да пэўных каапэрацыйных арганізацый, крам і г. д.

Усё гэта прыводзіць нарэшце да таго, што камісія тэатру прыхопцыі літаральна выпрошваць пару абутку, вопратку і нават паёк у тым ці іншым горадзе.

Як гэта ня дзіўна, але неабходна адзначыць для паўнаты малюнку і тое, што тэатр ня мае свайго лячэбна-кутарнага фонду тады, як апошні і па характару працы артыста вельмі патрэбен.

Вось у кароткіх рысах тыя абставіны, у якіх працуе актор гэтага тэатру. І таму зусім ня дзіўна, што тэатр ня мае колькаснага росту.

У той час, калі вучоба ва ўсіх галінах мастацтва мае вялікае значэньне, бо канкрэтна ўпіраецца ў неабходнасьць выпрацоўкі пралетарскага мэтаду, артысты пазбаўлены магчымасьці працаваць над сабою. А гэта зноў упіраецца ў адсутнасьць сталае базы.

З усяго сказанага мімаволі ўзьнікае пытаньне, чаму адпаведныя цэнтральныя ўстановы і арганізацыі да гэтага часу не зьвяртаюць на гэта ўвагі.

Так, калі НКА, напрыклад, крыху і цікавіцца працаю і жыцьцём тэатру, дык Гарсавет і асабліва праўленьне саюзу Рабіс зусім забыліся відаць пра яго.

Чым-жа інакш можна вытлумачыць той факт, што артысты зьвярнуўшыся з звядраваньня ня маюць кватэр.

Такое становішча працягвацца надалей, бязумоўна, ня можа. Тэатр павінен атрымаць нарэшце ўсе ўмовы для сваёй працы і далейшага разьвіцьця.

НКА, ЦСПСБ, Менскі гарсавет і падкрэсьліваем — цэнтральнае праўленьне саюзу Рабіс павінны бездакладна заняцца палепшаньнем матэрыяльна-бытавога становішча тэатру.

Брыгада газ. «Савецкая Беларусь»: Сідарэнка, Аронзс, Коган, Рутштэйн.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Мендзяржтэатр — СЁНЬНЯ гастроль расійскай опэры пад кіраўніцтвам Я. Е. Воўкава. КНЯЗЬ ІГАР (з пялявецкімі пляскамі) музыка БАРДЗІНА. Пачатак а 8 гадзіне. Білеты ў раб. касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк — СЁНЬНЯ ВЯЛІКІ ДНЯУНЫ ПАКАЗ. Пачатак а 2 газзіне. ВЕЧАРАМ. 1 гастроль аўрапэйскага атракцыёну ілюзіяністаў МАРЧЭС з яго трупай ліліпутаў. 2. ДОНВАЛЬДА—Татарская труппа. 3. ЭРНАНІ—Музычныя эксцэнтрыкі. 4. АЎТАМАТ-ЛЯЛЬКА—Фроэ. 5. ЖАКЕЙ АЛЕКСАНДР. Пачат. а 8 г. 45 х. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе

„Чырвоная Зорка“ — Замежны фільм ЧЫКАГО. Звыш праграмы кінохроніка Саюзкіно № 31. Пачатак а 7, 8-45 і 10-30. Каса з 5 г.

Кіно-тэатр „Культура“ — З 10 ліпеня новы савецкі прыгодніцкі фільм ТРАНСБАЛТ—у гал. ролі артысты МІНІШ. Звыш праграмы часопіс Белдзяржкіно № 12 —Ударны Койданаўскі раён. Пачатак а 7 гадзіне.

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Ната Вачнадзэ ў карціне ГЮЛІ. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз.

Кіно „Пралетары“ — Мастацкі фільм па роману Бэрковіча ЦЫГАНСКАЯ КРОЎ. Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

АБ'ЯВА

Васілевіцкі Леспрамгасвуч абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс лесаэксплёатацыйнага і лесакультурнага аддзяленьняў:

Школа рыхтуе ніжэйшы адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал па лясных загатоўках і лясной гаспадарцы, а таксама скончыўшыя школу будуць прымацца ў ВНУ пасьля 2-х гадовай працы на вытворчасьці.

ТЭРМІН НАВУЧАНЬНЯ—2 ГАДЫ

У школу прымаюцца скончыўшыя 7-годку, ШКМ. Да заяў далучаюцца наступныя дакументы (абавязкова ў арыгінале):

1. Аб адукацыі (пасьведчаньне аб скончэньні 7-мігодкі, ШКМ).
2. Аб узросьце (мэтрыка).
3. Мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароў'я паступаючага.
4. Анкета, засьведчаная партыйнымі, прафэсыйнымі, альбо савецкімі ўстановамі.
5. Даведка аб карыстаньні бацькоў выбарчымі правамі
6. Для сялян—закладны ліст, альбо засьведчаная копія яго аб падатку на 1930-31 г., а для саматужнікаў—адпаведны дакумант аб падатку на 1931 г.
7. Дакумант аб сацыяльным становішчы і матар'яльным стане паступаючага і яго бацькоў да рэвалюцыі і пасьля рэвалюцыі.
8. Дзьве фотографічныя карткі.
9. Паштовых марак на 30 кап.

Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 16 і ня вышэй 19 год.

Заявы пасылаць у канцылярыю школы (ст. Васілевічы Зах. чыг. Леспрамгасвуч) да 15 жніўня 1931 г.

Пачатак заняткаў з 1 верасьня г. г. Стыпэндыя ад 23 руб. 52 кап., якая пасьля 6-цімесячнай пасьпяховай вучобы павялічваецца да 44 руб.

У першую чаргу стыпэндыяй будуць забясьпечаны рабочыя, батракі, бядняки, калгасьнікі і іх дзеці.

Усе прыезджыя забясьпечваюцца інтэрнатам альбо кватэрамі пры школе на месцы.

ПРЫ ШКОЛЕ МАЕЦЦА СТАЛОЎКА

Без паведамленьня школы аб прыёме прыезд забараняецца.

Адміністрацыя школы.

1—2

Арганізаванае АДМ.-ГАСПАД. КІРАЎНІЦТВА Унівэрсытэцкага гарадка,

на падставе зацьверджанага палажэньня,

АБ'ЯДНАЛА АДМ.-ГАСП. ФУНКЦЫІ,

ЯКІЯ РАНЕЙ ВЫКОНВАЛІСЯ

БДУ, Мэд. і Хэм. інстытутамі па электрагаспадарцы, газазаводу, цэнтральным ацяпленьні дамоў, інтэрнатаў навуковых работнікаў БДУ, пажарная ахова, будаўніцтва і рамонт па гарадку

і таму заключэньне дагавораў і палучэньне грузаў для адзначаных галін гаспадаркі

З 1-VI ПРАВОДЗІЦЦА

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫМ КІРАЎНІЦТВАМ

Адрас Кіраўніцтва Унівэрсытэцкага Гарадка—САВЕЦКАЯ, 18, ГАЛОЎНЫ КОРПУС.

АБВЕСТКА

13 ліпеня г. г. роўна а 7 гадз. увеч у памяшканьні Гарсавету (Пляц Волі № 4, трэці паверх)

АДБУДЗЕЦЦА НАРАДА

членаў бюро сэкцыі Гарсавету, членаў бюро дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гор. Менску сумесна з пазаштатнымі інструктарамі прымацаванымі для кіраваньня працай дэпутацкіх груп.

ПАРАДАК ДНЮ:

1 Даклады дэпутацкіх груп прадпрыемстваў гор. Менску аб праробленай імі рабоце.

2. Аб справаздачнай кампаніі Гарсавету.

1—2

УВАРАВІЦКІЯ КУРСЫ ТРАКТАРЫСТАЎ АБВЯШЧАЮЦЬ

АСЕНЬНІ ПРЫЁМ

НА КУРСЫ ТРАКТАРЫСТАЎ БЕЛСАУГАСТРЭСТУ

На курсы прымаюцца ў першую чаргу рабочыя саўгасаў, батракі, калгасьнікі, сяляне-беднякі і сераднякі. Курсанты забясьпечваюцца кватэрамі і стыпэндыяй па 25 руб. у м-ц.

УМОВЫ ПРЫЁМУ:

Паступаючыя павінны быць ва ўзросьце 18-40 год, фізычна здаровыя, пісьменныя ў аб'ёме 4-хгодкі і пасьля курсаў павінны працаваць у саўгасах Белсаўгастрэсту на працягу 2-х год.

Да заяў павінны быць далучаны наступныя дакументы:

1. Аб узросьце, 2. Аб адукацыі, 3. Аб стане здароў'я і на 3 р. паштовых марак для адказу, акрамя таго рабочыя, батракі і калгасьнікі далучаюць камандыроўку саўгасу, калгасу, а сяляне-беднякі — акладнога ліста с-г падатку, аб выбарчым правы.

Прыём заяў да 25-га жніўня. Пачатак заняткаў на курсах з 5-га верасьня.

ЗАЯВЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСУ:

ст. Уза, Зах. чыг., п-а Уваравічы, к-ра трактарных курсаў.

Загадчык трактарных курсаў

УСІМ ПРАДПРЫЕМСТВАМ І АРГАНІЗАЦЫЯМ,

як'я ня ўнесьлі яшчэ першай паловы збору на патрэбы жыльлёвага будаўніцтва ад зарплаты рабочых і служачых

МЕНГАРФІНАДДЗЕЛ

Прапануе безадкладна ўнесьці належныя сумы гэтага збору. Адначасова пацьвярджаецца, што другая палова гэтага збору павінна быць абавязкова ўнесена ў гэтым месяцы не пазьней дню выдачы зарплаты за першую палову ліпеня г г.

Прадпрыемствы і ўстановы, ня прыслаўшыя Фінаддзелу вестак па ф. № 1 аб пералічэньні першай паловы жылзбору, абавязаны безадкладна іх прадставіць. Напамінаецца, што такія весткі патрэбна будзе прадставіць у Фінаддзел таксама і пры ўзносе другой паловы жылзбору.

Асобы незаконна затрымаўшыя ўзносы па жылбудаўніцтву будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці.

МЕНГАРФА.

Далёкаўсходняму Краявому Зямельнаму Праўленьню

ПАТРАБУЮЦЦА:

1. Інжынеры мэліоратары—па асушэньні, абваднеьні і водазабэзьпеньні.
2. Інжынэры—торфмайстры.
3 Аграномы—кармавікі, паляводы, па тэхнічных культурах, машынаназнаўцы.
4. Зоотэхнікі: па каняводзтву, па сьвінагадоўлі.
5. Інжынэры-будаўнікі.
6. Плянавікі па с-г.

Умовы працы па згодзе, ільготы згодна пастановы ЦВК СССР і СНК ад 12 жніўня (надрукавана ў весьніку НКТ № 31-31), кватэры даюцца.

Заяву накіроўваць па адрасу: Хабаровск, Крайзу сектор кадров.

Д. В. КРАЙЗУ.

ЗГУБЛЕНА круглая пячатка „Менскага Гарадзкога Камітэту Узаемадапамогі“ лічыць несапраўднай

Нарсуд Баркавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 9-га студзеня г. г. па арт. 196 1 ч. 195 КК. абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. с. Вальнцы таго-ж с.-с. загатоўшчыку Баркавіцкага Райкаапсаюзу Барадову Лайзэру Майсееву за нядбайныя адносіны да сваіх абавязкаў па загатоўчай працы.

Нарсуд Чавускага раёну, на падставе прысуду ад 5 чэрвеня г. г. па арт. 196—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне настаўніку Васілеўскай школы Зарэсьцянскага сельсавету Шусьцікаву Сьцепану за дапушчэньне насіць вучням яму прадукты, ў выніку чаго стварыліся неадпаўкавыя адносіны яго да вучняў школы.

Нарсуд Чавускага раёну, на падставе прысуду ад 19 чэрвеня г. г. па арт. 107-а з прымяненьнем 51 арт. КК, за хуліганства ў начны час у калгасе «КІМ» Прылескага сельсавету абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне калгасьнікам: Кавалёву Янку, Нікіценка Нікану і Александру і гр-нам в. Каменка: Смаляковым: Янку Сяргею і Александру.

Нарсуд Любаньскага раёну, на падставе прысуду ад 22 мая г. г., за дрэнся ў недастатковай працы па загатоўках усіх відаў, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне старшыні Любаньскага Райсаюза Якушэўскаму Язэпу Антоновичу і інструктару па загатоўках Любаньскага Райсаюзу Бараноўскаму Тодару Семкову.

Нарсуд Лёзьнянскага раёну, на падставе прысуду ад 21-га чэрвеня г. г. па арт. 196—213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-му Дубоўскаму Яўцэхію Лаўрэнаву намесьніку, майстру цэху фэкі «Карла Маркса», за парушэньне забясьпекі вынікам чаго было пакалечаньне рабочага.

Нарсуд 2 вуч. г. Менску, на падставе прысуду ад 8-га красавіка 1931 г. па арт. 107-а КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне, за хуліганства інструктару Аўтатэхнікуму Вароніну Мікалаю і інструктару Аўташколы Гуткіну Уладзімеру.

Петрыкаўскі РВК паведамляе, што ад гр-на пас. Капцэвічы тата-а сельсавету Швайца Васіля Самёнава паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Швайца» на прозьвішча «Малінін». Просьба асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, паведаміць аб гэтым Петрыкаўскі РВК паказаўшы сваё імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Нарсуд Сьмілавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 30 мая г. г. па арт. 196-213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне члену Капкаўскага с.-с., Сьмілавіцкага раёну Скрыпко Якубу Яўхімаву за нядбайныя адносіны да лесазагатовак.

Нарсуд Чырвона-Слободскага раёну, на падставе прысуду ад 26 мая г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне інструктару сэктару загатовак Чырвона-Слободзкага раённага спажыўтаварыства Місючэнку Ніканору Лук'янову, за нядбайныя адносіны да выкананьня сваіх службовых абавязкаў.

Настаўнік Людзэневіцкай школы паходжж. з сялян в. Кастрыцкай Слабодкі, Казулінскага сельсавету, Бабруйскага раёну Міхайлаў Сава Сьцяпанаў зьмяняе сваё імя і прозьвішча, Сава на Робэрт і Міхайлоў на Вішнеўскі.

Прыгарадны Нарсуд г. Гомелю, на падставе прысуду ад 3-га чэрвеня г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне працаўнікам кухні разьмеркавальніка № 1 Падольнеру Льву, Даніленке Якубу, Паўловічу Лявону, Зотаву Мавееву, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Ельскага раёну, на падставе прысуду ад 16-га мая г. г., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ны с. Ельск Аўраменка Лізавеце Майсеевай, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Рэчыцкага раёну, на падставе прысуду, за № 1363—1931 г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне начальніку Рэчыцкае чыгуначнае станцыі—Сняпкову Васілю Сяргееву, за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў.

У нарсуд Дрысенскага раёну паступіла заява ад гр-кі м. Дрыса Міроніч Маргарыты аб прызнаньні яе ў правох насьледства на дом у м. Дрысе па Сталінскай вул. № 6 застаўшайся пасьля сьмерці яе мужа Міровіча Доменіка.

Асобы, маючыя пратэнзіі на гэты дом могуць зварочвацца ў нарсуд Дрысенскага раёну ў працягу 6 мес.

Нарсуд Баркавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 20 лютага г. г. па арт. 212 з адзн. 1 ч. 195 з санкц. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну в. Фоэйзава Юзафоўскага сельсавету Баркавіцкага раёну Позару Міхасю Цімафееву, члену сельсавету, за ўдзел у п'янцы.

Студэнт Магілеўскага Пэдтэхнікуму Івэн Савасьцеевіч Пшык, родам з гр. г. Старага Быхава, пражыв. у гор. Магілеве, Быхаўская вул. № 18 зьмяняе сваё прозьвішча Пшык на прозьвішча Камышаў.

Просьба да асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, паведаміць аб гэтым Магілеўскі Гарадзкі ЗАГС, паказаўшы сваё прозьвішча, імя, імя па бацьку і месца пражываньня.

Нарсуд Копыскага раёну, на падставе прысуду ад 1 красавіка г. г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Гальдзінэру Якаву Ляксееву невыкананьне абавязкаў сельскага выканаўца.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44.

Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.

Галоўлітбел № 598

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСЬ